Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КРАСАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 73 (27931) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**20 КАНАЛАЎ**



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**



**Цэлая эпоха ў 30 секундах**

СТАР. 10



**Як пасябраваць з банкаматам?**

СТАР. 13

# ЗЕРНЕ — ДА РАЛЛІ



Фота БЕЛТА.

Сяўба — гарачы час і на прысядзібных участках.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Нестабільная знешнеэканамічная кан'юнктура аказвае негатыўны ўплыў на даходную частку бюджэту краіны. Па звестках Мінфіна краіны, бюджэт можа недаатрымаць з-за падзення цэн на сусветных рынках нафты да $1 млрд. Але абавязацельствы дзяржавы па сацыяльных расходах (заработная плата, пенсіі і іншыя меры сацыяльнай падтрымкі) будуць выкананы ў поўным аб'ёме. Урад пра гэта заяўляў у пачатку года, і цяпер я пацвярджаю гэта. Карэкціроўкі ў гэтым плане адбывацца не будзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.04.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14270,00 | ▼ |
| Еўра | 15200,00 | ■ |
| Рас. руб. | 287,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 665,27 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Нарасхват!

## РАЗМЕРКАВАННЕ З АРЫФМЕТЫЧНЫМ УХІЛАМ

### У БДПУ на аднаго маладога педагога прыпадае да шасці заявак

**Ёсць меркаванне, што сваё добрае імя і аўтарытэт у грамадстве настаўнікам трэба тэрмінова аднаўляць. Што імідж педагога залежыць не толькі ад узроўню матэрыяльнага дабрабыту, але, найперш, ад таго, наколькі сам педагог адпавядае патрэбам часу: ад яго здольнасці выходзіць за межы традыцыйных падыходаў і стэрэатыпаў, ад крэатыўнасці і эрудыцыі, ад умення вучыцца і вучыць гэтаму сваіх вучняў. Бо настаўнік перастае быць настаўнікам, калі перастае быць вучнем. А проста любіць дзяцей — недастаткова...**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У вышэйшых навучальных установах, якія рыхтуюць педагагічныя кадры, набліжаецца да завяршэння размеркаванне. Журналісты «Звязды» наведалі Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка ў той дзень, калі ўніверсітэцкая камісія размяркоўвала выпускнікоў чатырох спецыяльнасцей фізіка-матэматычнага факультэта: будучых настаўнікаў фізікі, матэматыкі, інфарматыкі і тэхнічнай творчасці. Што адразу кідалася ў вочы, дык гэта вялікая колькасць сярод выпускнікоў «факультэта дакладных навук». Ці затрымаюцца яны ў сістэме адукацыі надоўга?

### НА РАДЗІМУ...

— Усяго ў нас размяркоўваюцца сёння 133 чалавекі, у тым ліку 18 «мэтавікоў», а заявак ад наймальнікаў паступіла 213, — уводзіць нас у курс справы **дэкан фізіка-матэматычнага факультэта Уладзімір ШЫЛІНЕЦ.** — Паколькі вучыцца на нашым факультэце няпроста, то да выпускнога курса, на жаль, дайшлі не ўсе: колькасць адлічаных (тых, хто не справіўся з універсітэцкай праграмай) аказалася даволі істотнай.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## Пасля ветру прыйдзе дождж з мокрым снегам

### А яшчэ на выхадныя сіноптыкі абяцаюць замаразкі да мінус 3

**Сёння на тэрыторыю краіны пачне паступаць халоднае паветра з боку Балтыйскага мора. У многіх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература ўдзень ад 7 да 12 градусаў цяпла, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

І ў выхадныя, пад уплывам атмасферных франтоў і паветраных мас, захаваецца халаднаватае надвор'е. Уначы месцамі, а ўдзень амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовы дождж і мокры снег. Уначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень у суботу — 5-10 цяпла, у нядзелю — плюс 3-9 градусаў.

Захаваецца некамфортнае надвор'е і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак у многіх раёнах дождж і мокры снег. Тэмпература паветра ў ноч на панядзелак складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — 3-9 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у аўторак і сераду тэрыторыя краіны трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Кароткачасовыя ападкі чакаюцца толькі месцамі. Гэта будзе дождж і часам дождж з мокрым снегам. Тэмпература ўначы будзе складаць ад 3 градусаў марозу да 3 цяпла, удзень чакаецца не больш за плюс 4-10 градусаў. Згодна з доўгатэрміновым прагнозам, толькі напрыканцы наступнага тыдня з боку Заходняй Еўропы да нас завітаюць больш цёплыя паветраныя масы і пачнецца сапраўдная вясна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АДЧУЦЬ ПЛЯЧО СЯБРА

## Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным павялічыць эфектыўнасць узаемадзеяння з Кітайскай Народнай Рэспублікай

**Пра гэта кіраўнік дзяржавы заявіў, прымаючы з дакладам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Косінца, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі склаліся вельмі добрыя адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай. «Гэта адзін з асноўных нашых палітычных, эканамічных, дыпламатычных партнёраў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў перакананне, што Беларусь павінна больш эфектыўна супрацоўнічаць з кітайскімі партнёрамі. «Яны ідуць насустрач, і крэдытных рэсурсаў выдаткоўваюць практычна столькі, колькі мы нават і не просім. Але не заўсёды мы знаходзім дастатковую колькасць эфектыўных праектаў пад гэтыя крэдыты», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Косінец далажыў Прэзідэнту аб выніках сваёй паездкі ў КНР 8-11 красавіка, падчас якой абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі візіту ў Беларусь Старшыні КНР Сі Цзіньпіна. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта праінфармаваў, што ў час паездкі ў КНР разглядаліся і розныя аспекты палітычнага дыялогу дзвюх краін, міжнароднага і гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, узаемадзеяння ў банкаўскай сферы, у крэдытна-інвестыцыйнай палітыцы. Закраналіся таксама пытанні будаўніцтва Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка.

«Гэта сведчыць аб тым, што кіраўніцтва Кітая да нас даверліва ставіцца. Мы гэта павінны шанаваць. Усё ж такі гэта краіна, якая сёння па ўсіх паказчыках вырвалася наперад, і нам пашанцавала, што мы 20 з лішнім гадоў таму пачалі супрацоўніцтва з КНР», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнту было далажана аб выкананні яго даручэнняў, дадзеных у час прадстаўлення Аляксандра Косінца на пасадзе кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. «Ёсць, напэўна, не проста ўражанні, а падставы для высноў, для прыняцця нейкіх істотных рашэнняў па эфектыўнасці працы Адміністрацыі Прэзідэнта», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на кантроль выканання рашэнняў. «У нас, трэба прама сказаць, калі не катастрофа, то нейкая вольніца. Некаторым службовым асобам трэба па два разы нагадваць тое, што Прэзідэнт прымаў рашэнні па нейкіх праблемных пытаннях», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта далажыў аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў галіне кадравай палітыкі, ідэалогіі, сацыяльна-эканамічнага развіцця, у частцы забеспячэння выканання шэрагу ўказаў і дырэктыў, накіраваных на паляпшэнне якасці жыцця грамадзян.

# СУДОВА-ПРАВАВАЯ СІСТЭМА ДЗЕЙНІЧАЕ ЭФЕКТЫЎНА

## А яе рэформа ўжо выходзіць на завяршальную стадыю

**Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Вярхоўнага Суда Валянцінам Сукалам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідуць справы з правядзеннем судова-прававаой рэформы. «Асабліва не ўмешваючыся і не кантралюючы, турбуюся, ці пераварым мы гэта ўсё. Вылучылі Следчы камітэт: натуральна, што сам працэс ад дазнання да судовага разбору павінен быў стаць больш эфектыўным, дзейсным, выніковым. А потым яшчэ аб'ядналі суды агульнай юрысдыкцыі з эканамічнымі судамі», — сказаў Прэзідэнт.

«Беларусь часта абвінавачваюць у нейкім аўтарытарызме, яшчэ ў чымсьці. Пастаянна ідуць дыскусіі, асабліва мы чуем у Расіі, аб незалежнасці судоў і гэтак далей, і таму падобнае. Але мы ўжо столькі рашэнняў прынялі зусім нядаўна», — адзначыў Прэзідэнт .

Асноўныя палажэнні судова-прававаой рэформы сфармуляваны ў пасланні кіраўніка дзяржавы аб перспектывах развіцця сістэмы агульных судоў. Яно змяшчае 54 канкрэтныя даручэнні; 48 з іх выкананы; яшчэ шэсць, што засталіся, знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі. Чакаецца, што сёлета апошні этап судова-прававаой рэформы будзе завершаны.

# ПА МАРШРУЦЕ ДЭЛІ — МІНСК

**Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы мае намер у бліжэйшы час наведаць Беларусь. Аб гэтым ён заявіў, прымаючы міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея, паведамляе БЕЛТА**

Кіраўнік Індыі канстатаваў дружалюбны характар адносін з Беларуссю, адзначыўшы наяўнасць вялікага патэнцыялу двухбаковага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай сферы, адсутнасць нейкіх рознагалоссяў на міжнароднай арэне.

■ Інтэграцыя

# ВАЛЮТНЫ САЮЗ НЕАБХОДНЫ

**Пра гэта заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на III міжнародным форуме «Еўразійская эканамічная перспектыва», які адбыўся ў Санкт-Пецярбургу.**

Аднак для гэтага неабходна ліквідаваць усе выключэнні і недапрацоўкі ў эканамічнай інтэграцыі краін ЕАЭС. Хоць і варта паспяшацца: «Мы запланавалі валютную інтэграцыю на 2025 год, але за 10 гадоў можа вельмі шмат што адбыцца. Па магчымасці трэба паскараць гэты працэс», — сказаў Міхаіл Мясніковіч падчас агульнай дыскусіі на форуме. Прадстаўнікі іншых, дзейных і будучых (Кыргызстан), членаў Еўразійскага эканамічнага саюза таксама падтрымліваюць гэту ідэю. Напрыклад, член калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Карынэ Мінасян паскардзілася на тое, што курсавая розніца і валютныя скачкі вельмі негатыўна ўплываюць на эканамічнае супрацоўніцтва.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,**
***г. Санкт-Пецярбург***

■

■ Навіны, факты, каментарыі

### ЗАРОБЛЕНЫЯ ГРОШЫ ПОЙДУЦЬ НА АЗДАРАЎЛЕННЕ ДЗЯЦЕЙ І СВЯТКАВАННЕ ПЕРАМОГІ

**Сваёй пастановай №21 ад 9 красавіка Міністэрства фінансаў Беларусі растлумачыла парадак пералічэння грашовых сродкаў, якія будуць зароблены на рэспубліканскім суботніку 18 красавіка.**

Згодна з гэтым дакументам, органы дзяржкіравання, дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя ўраду, і іншыя юрыдычныя асобы будуць пералічваць зароблены на суботніку грошы ў аб'ёмах, якія добраахвотна вызначаюць іх работнікі, на бягучыя рахункі раённых і гарадскіх выканкамаў. Потым яны будуць пералічаны на рахункі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. У пастанове гаворыцца, што грошы, якія плануецца зарабіць сёлета на рэспубліканскім суботніку, будуць накіраваны на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона. Яны таксама пойдуць на рэалізацыю мерапрыемстваў, звязаных са святкаваннем 70-й гадавіны Перамогі.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

### ВЫДАЛА Ў ДЗЕСЯЦЬ РАЗОЎ БОЛЬШУЮ СУМУ

**Сталічная міліцыя вышуквае жанчыну, якой у банку памылкова выдалі лішнія 1625 доларaў.**

У Фрунзенскае РУУС звярнулася касір абменнага пункта, размешчанага ў адной з крам па вуліцы Ляшчынскага, з просьбай аказаць дапамогу ва ўстанаўленні асобы невядомай жанчыны, якой яна выдала буйную грашовую суму. Кліентка апоўдні падышла да акенца касіра з просьбай канвертаваць 10 тысяч расійскіх рублёў у долары. Работніца «абменніка» замест таго, каб выдаць належныя 180,5 долара, выдала 1805 доларaў. Жанчына забрала грошы і сышла. Касір заўважыла недастачу ў канцы дня. Кліентка трапіла ў поле зроку камер відэаназірання.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
**ОАО «Завод «Белпласт»**
**18 мая 2015 года в 14.00**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**по адресу: г. Минск, ул. Гусовского, 2,**
**ОАО «Завод «Белпласт» (кабинет директора)**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**
1. О рассмотрении проекта типового договора совместной деятельности и управления в холдинге между ООО «ПромЭнергоБаланс консалт» и ОАО «Завод «Белпласт».
2. Об участии ОАО «Завод «Белпласт» в холдинге «ПромЭнергоБаланс» путем заключения договора совместной деятельности и управления в холдинге с управляющей компанией холдинга – ООО «ПромЭнергоБаланс консалт».
3. О наделении директора ОАО «Завод «Белпласт» Новаковского В.Л. полномочиями на подписание договора совместной деятельности и управления в холдинге с управляющей компанией холдинга – ООО «ПромЭнерго-Баланс консалт».

Регистрация участников собрания проводится в день собрания в приемной ОАО «Завод «Белпласт» (2 этаж) с 13.00 до 13.45.
Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.
Представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.
*Наблюдательный совет ОАО «Завод «Белпласт»*
УНП 100008342



**В извещение ОАО «Пинема», опубликованное в газете «Звязда» № 58 от 27.03.2015 г., ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩЕЕ ДОПОЛНЕНИЕ:**
порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящего в собственности хозяйственного общества, утвержденным решением наблюдательного совета № 156 от 18.11.2014 г.
УНП 200187659


■ Блізкая ўлада

# ДАПАМОЖАМ, ЧЫМ ЗМОЖАМ

**Падчас прыёму грамадзян у Маладзечне старшынёй Мінаблвыканкама Сямёнам Шапірам да людзей, што сядзелі ў чарзе, падышла пажылая жанчына. «Ці тут прымае кіраўнік вобласці?» — пацікавілася.**

**— А вы па запісе? — запыталі ў яе.**

**— Так, я толькі што запісалася ў міліцыянера, што дзяжурыць пры ўваходзе.**

**У адказ усе засмяяліся: маўляў, які ж гэта «запіс»?**



Але Зою Краўчанку Сямён Шапіра ўсё роўна прыняў. Зоя Якаўлеўна шмат гадоў працавала на Маладзечанскім радыёзаводзе «Спадарожнік». Тут атрымала жыллё. У розныя часы яго пераводзілі то ў жыллёвы фонд, то ў статус інтэрната. Яна хвалюецца, што жыллё можа стаць арэндным, а ёй, пенсіянерцы, не пад сілу будзе разлічвацца за яго. Ды і наогул Зоя Якаўлеўна баіцца, што новы ўласнік — ЖКГ — папросіць яе вызваліць памяшканне.

Старшыня аблвыканкама супакоіў заяўніцу: ніхто не мае права пазбавіць заслужанага чалавека жылплошчы. Нават калі дапусціць, што жыллё перавядуць у разрад арэндных, то ёй як ветэрану працы мясцовыя ўлады маюць права ўстанавіць паніжаны каэфіцыент аплаты.

## ЖЫЛЛЮ ТУТ МЕСЦА?

Васіль Бельскі купіў у мясцовага райспажыўсаюза будынак у вёсцы Гердуцішкі, дзе раней месцілася крама. Цяпер памяшканне пустуе. Зрэшты, як было відаць на здымку, гэта далёка не палац. Звычайны цагляны дом. Васіль Міхайлавіч прасіў у мясцовых улад дазволу перавесці нежылое памяшканне ў жылое, аднак згоды на гэта не атрымаў. Па словах старшыні Маладзечанскага райвыканкама Аляксандра Яхнаўца, паводле заканадаўства пераводзіць у жылы фонд можна толькі тыя будынкі, якія з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю.

Здавалася б, чалавек купіў гэты будынак і мае права распараджацца ім па сваім жаданні. Тым больш што і дзяржава зацікаўлена ў тым, каб на сяле не заставалася пустуючых дамоў, каб у кожнага з іх быў гаспадар, які б падтрымліваў тут належны парадак.

У сувязі з гэтым кіраўнік цэнтральнага рэгіёна даручыў начальніку галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама Аляксандру Бачылу на працягу месяца дэталёва вывучыць пытанне і магчымасць вырашыць яго на абласным узроўні. А пры неабходнасці выпрацаваць прапановы аб унясенні змен у заканадаўства, з якімі выйсці ў парламент.

## САМАБУДЫ — ПАД ЗНОС

Віктар Радзілавец прыйшоў з просьбай узаконіць гаражы, перагледзеўшы рашэнне Красненскага сельвыканкама аб іх зносе.

Гаражы ўзведзены без адпаведнага дазволу яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя. Адзін з такіх самавольных аб'ектаў і купіў Віктар Мікалаевіч. Раней такія самабуды на Міншчыне можна было аформіць дакументальна. Але сёння прынята рашэнне на ўзроўні вобласці аб іх адназначным зносе, каб не ствараць прэцэдэнт для мабавага ўзвядзення «самапалаў» паўсюдна. Прычым гэтае рашэнне распаўсюджваецца не толькі на гаражы, а і на ўсе самавольныя пабудовы.

Разам з тым Віктар Радзілавец выкарыстоўваў памяшканне і пад склад, і пад рамонтную майстэрню. Таму Сямён Барысавіч параіў прадпрымальніку звярнуцца ў сельвыканкам з заявай аб выдзяленні яму зямельнага ўчастка для будаўніцтва неабходных аб'ектаў на законнай падставе.

## ДЗЕЦЯМ — СЯМ'Ю

Аксана Шымель з мужам пераехалі ў Маладзечанскі раён з Вілейскага і адразу ж сталі ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў: у сям'і гадуецца 5 дзяцей. Цяпер жывуць у інтэрнаце, што належыць ААТ «Забудова» ў Чысці. Агульная плошча памяшкання 47 квадратных метраў, жылая — 33. Мясцовыя ўлады прапаноўвалі ім трохпакаёвую кватэру ў горадзе, зямельныя ўчасткі для будаўніцтва індывідуальнага жылля. Але ніводзін варыянт не задаволіў сужэнцаў.

Аксана Валер'еўна прапанавала свой варыянт вырашэння жыллёвага пытання: «Па тэлевізары перадаюць, што ў Мінскай вобласці для прыёмных сем'яў будуюць дыхтоўныя дамы. Я згодна ўзяць яшчэ 5 дзяцей з прытулку. Толькі выдзеліце мне катэдж».

— Мы не супраць такога варыянту, — адказаў Сямён Шапіра. Але папрасіў рэдактара «Маладзечанскай газеты» Аляксандра Лазоўскага наведаць гэтую сям'ю асабіста, паглядзець, у якіх умовах выхоўваюцца дзеці, выслухаць меркаванне супрацоўнікаў службы сацыяльнай апекі, педагогаў, суседзяў. «Праз тыдзень дайце мне інфармацыю. Мы дасканала праанaлізуем яе. Калі бацькі характарызуюцца станоўча з усіх бакоў, то няхай бяруць малых і гадуюць. Кожнае дзіця павінна мець сваю сям'ю, выхоўвацца ў добрых умовах і клопаце, — канстатаваў старшыня аблвыканкама.

У гэты дзень Сямён Шапіра прыняў 15 чалавек.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

# НАЙВЫШЭЙШАЯ ЎЗНАГАРОДА ЗА ЯКАСЦЬ АБАВЯЗВАЕ

**Учора самыя лепшыя арганізацыі краіны атрымалі прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці за 2014 год. Усяго лаўрэатамі гэтай прэміі ўрада за 16 гадоў сталі 197 арганізацый Беларусі, паведаміў учора прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу.**

Андрэй Кабякоў адзначыў, што прэмія ўрада за дасягненні ў галіне якасці з'яўляецца найвышэйшай узнагародай, якую можа атрымаць арганізацыя, што дасягнула значных поспехаў у выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі і паслуг, авалодала высокаэфектыўнымі метадамі менеджменту і прагрэсіўнымі тэхналогіямі.

У 2014 годзе гэтае званне прысвоена 14 арганізацыям упершыню, 16 пацвердзілі званне лаўрэата паўторна, тры арганізацыі сталі дыпламантамі конкурсу і дзве ўдастоены спецыяльных узнагарод.

Як адзначыў кіраўнік урада, лаўрэаты прэміі — гэта арганізацыі, для якіх якасць мае найвышэйшую каштоўнасць. Яны паспяхова вырашаюць праблему павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі (паслуг), скіраваны на комплекснае вырашэнне пытанняў якасці прадукцыі і паслуг, маюць дастатковыя гарантыі збыту сваіх тавараў, ужываюць эфектыўныя формы і метады кіравання, умеюць своечасова прадбачыць патэнцыйныя патрэбы заказчыкаў і забяспечваюць высокія тэмпы эканамічнага развіцця сваіх арганізацый.

Упершыню ў гісторыі конкурсу былі вызначаны ўладальнікі спецыяльных узнагарод: акцыянернае таварыства «Кераміка» (г. Віцебск) — у намінацыі «Лідарства» за ўклад кіраўніцтва ў дасягненне ўстойлівага поспеху арганізацыі і Бярозаўскі сыраробны камбінат — у намінацыі «Сацыяльная адказнасць» за ўкараненне сацыяльна адказнага бізнесу і стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць сацыяльную абароненасць усіх груп зацікаўленых бакоў (персаналу, спажыўцоў, партнёраў, грамадства).



Андрэй КАБЯКОЎ уручыў узнагароду РУП «Гатэль «Мінск».

Сярод пераможцаў конкурсу 2014 года арганізацыі міністэрстваў архітэктуры і будаўніцтва, прамысловасці, сельскай гаспадаркі і харчавання, транспарту і камунікацый, унутраных спраў, абароны, Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама арганізацыі без ведамаснай падпарадкаванасці.

Усе 22 арганізацыі, якія з'яўляюцца пераможцамі конкурсу 2014 года, маюць сертыфікаваныя сістэмы менеджменту якасці па ISO 9001, 8 арганізацый укаранілі сістэмы кіравання навакольным асяроддзем па ISO 14001, 12 — сістэмы кіравання аховай працы па СПБ 18001.

Звесткі аб прадпрыемствах-лаўрэатах і іх прадукцыі размяшчаюцца на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by), уключаюцца ў штогадовы каталог, які накіроўваецца ў прадстаўніцтвы Беларусі за мяжой.

Таксама падчас цырымоніі былі адзначаны нагрудным знакам «Лідар якасці» кіраўнікі шэрагу прадпрыемстваў, якія дасягнулі найвышэйшых вынікаў у галіне якасці прадукцыі (паслуг) і сістэмнага менеджменту, уручаны дыпломы пераможцам конкурсаў «Лепшы менеджар па якасці» і «Лепшая дыпломная і навукова-даследчая работа студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці» 2014 года.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Садружнасць

# ПРАЦЯГ ЛІТАРАТУРНАГА СЯБРОЎСТВА

**Выдавецкі дом «Звязда» па ініцыятыве і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі краіны праводзіць вялікую работу па развіцці і ўмацаванні стасункаў літаратур народаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Прэміяй «Зоркі Садружнасці» быў адзначаны кніжны праект «Сугучча» з 11 тамоў. А цяпер да ўвагі чытачоў прапануецца другі выпуск альманаха «Сугучча».**

Укладзены Вольгай Аляксеевай зборнік носіць канкрэтную і выразную назву — «Сугучча. Беларусь — Масква», што азначае супольнае прадстаўніцтва ў кнізе пісьменнікаў, якія жывуць і працуюць як у Мінску, так і ў Маскве.




«Хацелася б звярнуць увагу чытачоў, што мы знаёмім праз новы выпуск «Сугучча...» з навінкамі, добрай сучаснай літаратурай, рэкламуем творчасць расійскіх калег, — гаворыць Вольга Аляксеева. — Раздзел «Масква» складаецца з п'есы галоўнага рэдактара «Литературной газеты» Юрыя Палякова «Аднакласніца», прозы і паэзіі Георгія Прахіна, Яўгена Шышкіна, Любові Турбінай, Валерыя Казакова. Марыя Якубоўская выступае з артыкулам «Архетып творчага свету пісьменніка Валерыя Казакова як парадыгма для фарміравання культуралагічнага светапогляду студэнтаў».

А ў «беларускім» раздзеле — урывак з аповесці Андрэя Федарэнкі "Дзікі Луг", падборка вершаў Віктара Шніпа, урыўкі з аповесцяў Алега Ждана і Уладзіміра Саламахі, з рамана Мікалая Чаргінца, вершы Віктара Гардзея, Ірыны Карнаухавай, артыкул Цімафея Ліякумовіча пра Янку Купалу і Міхаіла Ісакоўскага, эсэ Міхаіла Прымакі пра творчасць Івана Мележа.

— Тое, што альманах «Сугучча» выдаецца на рускай мове, — дзеліцца сваімі ўражаннямі пра кнігу азербайджанскі паэт і член рэдакцыйнага савета Чынгіз Алі аглу, — як на мой погляд, дазваляе шырока прадстаўляць беларускую літаратуру і літаратуры іншых постсавецкіх краін у шырокім свеце. Магчыма, якраз публікацыя ў «Сугуччы» дазволіць звярнуць увагу на тых ці іншых пісьменнікаў і ў нас у Азербайджане, і ў Турцыі ці Іране. Не кажу пра тыя былыя савецкія рэспублікі, дзе менавіта руская мова дазваляе быць мастом дружбы, актыўнага камунікату і ў творчых справах.

А ў планах Выдавецкага дома «Звязда» — падрыхтоўка новых выпускаў альманаха «Сугучча».

**Сяргей ШЫЧКО**

■ Парламенцкі дзённік

# НАСТРОЕНАСЦЬ — НА ПАГЛЫБЛЕННЕ АДНОСІН

**Двухбаковыя стасункі развіваюцца вельмі актыўна. Тым не менш і Казахстан, і Беларусь настроены на пошук новых магчымасцяў для паглыблення і пашырэння гэтых адносін, якія заўсёды асноўваліся на сяброўстве і ўзаемаразуменні. Пра гэта падчас сустрэчы з паслом Казахстана ў Беларусі Ергалі БУЛЕГЕНАВЫМ заявіў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў.**

Спікер падкрэсліў важнасць таго, што ў развіцці кантактаў па ўсіх кірунках выключна вялікая роля належыць прэзідэнтам нашых дзяржаў, якія рэгулярна сустракаюцца. Як нагадаў Уладзімір Андрэйчанка, апошняя такая сустрэча адбылася ў сакавіку гэтага года ў Астане.

— Мы ведаем, што ў Казахстане 26 красавіка адбудуцца пазачарговыя выбары, — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Натуральна, мы цікавімся і палітычнай сітуацыяй у вашай краіне, бачым, як многа зрабіў ваш прэзідэнт для развіцця адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Казахстанам. Мы дэлегуем намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктара Гуменскага, які будзе каардынатарам групы назіральнікаў па лініі Міжпарламенцкай асамблеі СНД.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

# ВОПЫТ ВЯДЗЕ Ў БОЙ



**Матчам Беларусь — Бразілія распачнецца сёння 11-ты чэмпіянат свету па футзале. Статыстамі наша каманда на гэтым турніры быць не збіраецца. Дружына Сяргея Сафонава летась стала найлепшай на чэмпіянаце Еўропы, а цяпер хоча пазмагацца за медалі самага важнага турніру. І як лічыць 31-гадовы нападаючы Аляксей НАЛІВАЙКА, старажыл нашай зборнай, калектыў для гэта падабраўся добры.**

***— Аляксей, для падрыхтоўкі да першынства свету для вас, на маю думку, стварылі выдатныя ўмовы,*** — звяртаюся да суразмоўцы.

— Так, і падобных умоў у нас яшчэ ніколі не было. Мы нясём вялікую адказнасць. Сваёй гульнёй хочацца паказаць балельшчыкам, што вынікі, якіх мы дасягнулі ў апошні час, невыпадковыя. Чэмпіянат свету, дарэчы, упершыню за 25 гадоў праходзіць у Еўропе. І арганізатары хочуць даказаць, што ў нас можна праводзіць спаборніцтвы падобнага маштабу не горш, чым у Лацінскай Амерыцы, дзе футзал вельмі папулярны.

***— У зальным футболе вы ўжо 10 гадоў. Памятаеце, як усё пачыналася?***

— На той момант я толькі-толькі пачаў выступаць за брэсцкі «Меркурый», а дагэтуль гуляў у вялікі футбол. З дублюючым складам брэсцкага «Дынама» стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату краіны, правёў 30 матчаў за асноўны склад. Выходзіў на поле разам з сённяшнім трэнерам «дынамаўцаў» Сяргеем Кавальчуком, са старажыламі каманды Сяргеем Грыбам, Андрэем Пракапюком. Але ў каманду прыйшоў новы трэнер — я сышоў. Крыху пагуляў у першай лізе за «Бярозу» і вырашыў, што трэба паспрабаваць свае сілы ў міні-футболе, футзале. Перакваліфікаваўся з абаронцы ў нападаючага.

На звычайныя матчы футзальнага чэмпіянату краіны гледачоў прыходзіць няшмат, але на фінальным паядынку Кубка ўладальнікаў кубкаў у 2006 годзе, калі мы з «Меркурыем» перайгралі маскоўскае «Дынама», на трыбунах брэсцкага спарткомплексу «Вікторыя» сабралася каля трох тысяч балельшчыкаў. А нядаўна шмат заўзятараў прыйшло на нашы матчы ў Пінску, дзе праходзіў тур чэмпіянату краіны. Там футзал сапраўды папулярызуецца. Акрамя таго, ёсць свая каманда, якая дэманструе добрыя вынікі.

***— Заўважыў, што амаль уся ваша кар'ера звязана з Брэстам.***

— Атрымліваецца, што так. Толькі адзін сезон пагуляў за міні-футбольны «Камунальнік» з Бярозы. А апошнія тры гады выступаю за каманду «Брэстдругчармет», паралельна працую старшым інспектарам мытнага паста «Маларыта». Аглядаю машыны, афармляю груз, збіраю пошліну. Трэніруюся ў вольны ад працы час. Варта адзначыць, брэсцкая мытня і Дзяржаўны мытны камітэт ва ўсім падтрымліваюць сваю каманду «Меркурый», а таксама выступленне сваіх супрацоўнікаў на міжнародных спаборніцтвах.

***— Ці праўда, што гомельскі ВРЗ — адзіная прафесійная футзальная каманда краіны?***

— Напэўна, але і ў нашым «Брэстдругчармеце» працоўныя дагаворы з гульцамі таксама падпісваюць.

***— Грошай, якія спартсмены зарабляюць футзалам, хопіць на тое, каб, напрыклад, аплаціць арэнду кватэры?***

— Хопіць, але мы паралельна ўдзельнічаем у рэгіянальных, камерцыйных, гарадскіх спаборніцтвах. Паспяховыя вынікі ў гэтых турнірах прэміруюцца.

* * *

***— Што з сябе ўяўляе сённяшняя зборная краіны?***

— Ёсць касцяк каманды. Яго складаюць футбалісты, якія заваёўвалі «золата» на леташнім першынстве Еўропы. У зборную прыйшло шмат добрай моладзі. Мяркую, хлопцы дабавяць агрэсіі ў наш футбол, і мы станем для сапернікаў яшчэ больш небяспечным апанентам.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Вас, як самага сталага гульца зборнай, партнёры ласкава дзядулем не называюць?***

— Не, у нас у зборнай пануе добрая атмасфера. Ведаеце, маладыя хлопцы неяк незаўважна ўліліся ў калектыў. Каманда амаладзілася, і я сам пачаў адчуваць сябе маладзейшым. Ніякай «дзедаўшчыны» ў нас няма. Калі мая чарга на трэніроўцы несці мячы і манішкі, я гэта раблю. У нас усе роўныя.

***— Варатара, капітана нашай зборнай Дзмітрыя Кудзі называюць непрабівальнай сцяной. Пацвярджаеце?***

— Ён дакладна найлепшы варатар Еўропы ў футзале! Такіх, як ён, я яшчэ не бачыў. Яму рэальна складана забіць. Ён аддаецца кожнаму моманту нават на трэніроўцы.

***— З галкіперам разабраліся. А хто з палявых гульцоў у вас выклікаў незабыўныя ўражанні?***

— Бельгіец Мустафа Абасі. У яго выдатная тэхніка. Добра б'е па варотах. Заставацца з ім сам-насам нельга. Трэба, каб нехта з партнёраў цябе абавязкова страхаваў. Шмат добрых футзалістаў ёсць у Калумбіі, Венесуэле, але мы часцей сустракаемся з еўрапейскімі камандамі.

***— Наш квартэт на чэмпіянаце ўжо паспелі назваць «групай смерці».***

— Па падборы зборных ён насамрэч вельмі моцны. Сур'ёзна падрыхтавалася да турніру Аўстралія. Што тычыцца Бразіліі, Уругвая, гэта вельмі тэхнічныя зборныя.

***— Кіраўніцтва паставіла задачу быць у прызёрах?***

— Так, трапіць у тройку. Але, паўтаруся, пацвердзіць свой статус чэмпіёнаў Еўропы тут будзе вельмі няпроста. Акрамя таго, у краіне ёсць інтарэс да спаборніцтваў. Рэклама — паўсюль. Ціск адчуваецца. З намі нават псіхолаг займаўся, каб не перагарэлі. Усё ж такі шанц згуляць на першынстве свету ў сваёй краіне можа быць адзіным у жыцці. І нам вельмі хочацца згуляць на ім добра.

***— Аляксей, ваша асабістая група фанпадтрымкі ўжо сфарміравалася?***

— «Хварэць» за мяне будуць 20 чалавек на чале з жонкай і дочкамі Юляй і Ульянай. А з брэсцкай мытні прыедзе цэлы аўтобус балельшчыкаў, каб падтрымаць зборную і сваіх супрацоўнікаў!

***— Які з заваяваных трафеяў лічыце самым значным?***

— Яркая перамога з «Меркурыем» у тым самым Кубку ўладальнікаў кубкаў еўрапейскіх краін у 2006 годзе. Нам тады прысвоілі званні майстроў спорту, а на працы ўрачыста ўзнагародзілі імяннымі гадзіннікамі, уручылі нагрудныя знакі. Аднак адчуць цудоўныя эмоцыі, узысці на п'едэстал хочацца і на гэтым чэмпіянаце свету. А якім будзе месца, пакажа час.

**Тарас ШЧЫРЫ**

# РАЗМЕРКАВАННЕ З АРЫФМЕТЫЧНЫМ УХІЛАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першымі размяркоўваліся выпускнікі спецыяльнасці «Матэматыка. Інфарматыка» — усяго 71 чалавек. Камісія зачытвае прозвішча выпускніка і месца, якое прапануецца яму для размеркавання. Адразу становіцца зразумелым, што для выпускнікоў размеркаванне не з'яўляецца непрыемным сюрпрызам. Усе мінчане застаюцца ў Мінску. Прычым многія з выпускнікоў ведаюць і канкрэтную навучальную ўстанову, дзе яны будуць працаваць, бо адтуль на іх рабілі персанальны запыт. Некаторыя са студэнтаў ужо працуюць у гэтых установах або праходзілі там педагагічную практыку і спадабаліся свайму будучаму кіраўніцтву. Што цікава, для сталічных жыхароў важна не проста застацца ў горадзе, але і выбраць школу, блізкую ад дому. Напрыклад, двое з хлопцаў пажадалі працаваць абавязкова ў Ленінскім раёне сталіцы і запасліся персанальнымі запытамі...

А вось іншагародняя выпускнікі, як правіла, вяртаюцца на радзіму. За Мінск ніхто не трымаецца...

— Нясвіжскі раён, мэтавае накіраванне... Вяртаецеся з радасцю? — цікавіцца ў выпускніцы **намеснік старшыні ўніверсітэцкай камісіі па размеркаванні, прарэктар па вучэбнай і інфармацыйна-аналітычнай рабоце Валерый ЗЕЛЯНКЕВІЧ.**

Цікава, што першым месцам працы маладых спецыялістаў стануць не толькі школы. Выпускнікі педагагічнага ўніверсітэта будуць працаваць таксама ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы гандлю, машынабудаўнічым каледжы, механіка-тэхналагічным каледжы, у Цэнтры студэнцкай творчасці БДПУ, нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», гарадскім адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар», Мінскім палацы дзяцей і моладзі...

## МУЖЧЫНСКІ КАЛЕКТЫЎ — НЕ ПРАБЛЕМА

Выпускніца спецыяльнасці «Фізіка. Інфарматыка» Наталля Сінкевіч размеркавалася ў Мінскі дзяржаўны ліцэй № 10 будаўнікоў. Цікавімся, ці будзе камфортна дзяўчыне працаваць у мужчынскім калектыве?

— Я выкладаю інфарматыку ў ліцэі ўжо другі год — універсітэт дазваляе студэнтам сумяшчаць вучобу і работу. Сапраўды, 90 працэнтаў маіх вучняў — гэта хлопцы: з 11 груп, у якіх я працую, дзяўчаты ёсць толькі ў дзвюх. Але я не бачу ў гэтым праблемы. Дапускаю, што многія з аднагрупнікаў, калі б апынуліся на маім месцы, не вытрымалі і збеглі б ад цяжкасцяў, але ў мяне баявы характар. Да таго



«Ёсць пытанні? Пажаданні? Сумненні? Тады размяркоўваемся...»

Але былі выпадкі, якія выбіваліся з агульнай карціны. Так, просьбу аднаго з выпускнікоў камісія катэгарычна адмовілася разглядаць. Справа ў тым, што замест таго, каб паехаць у Крупскі раён па дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста, студэнт вырашыў працаўладкавацца ў органы ўнутраных спраў.

**Для сталічных жыхароў важна не проста застацца ў горадзе, але і выбраць школу, блізкую ад дому.**

— Мэтавая падрыхтоўка — гэта святое. Варыянт адзін — або адпрацаваць, або вяртаць грошы за ўсе гады навучання! — патлумачылі яму ў камісіі.

Яшчэ адзін студэнт паабяцаў прынесці ў рэзервовы дзень на сябе персанальны запыт, які пакуль не паспеў прыйсці з Гомеля. Таму рашэнне адправіць яго ў Стаўбцоўскі раён было адкладзена да 23 красавіка.

Знайшоўся і малады чалавек, які па размеркаванне ўвогуле не прыйшоў.



Педагогі ў чарзе па першае працоўнае месца.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Так.

— Поспехаў вам!

— У Салігорскі раён размяркоўваецеся? Чаму, як не замужам, дык адразу ў Салігорск, бліжэй да шахцёраў? — жартуюць члены камісіі, падбадзёрваючы наступную выпускніцу.

У геаграфіі размеркавання фігуруюць Клецкі, Смаргонскі, Чэрвеньскі, Мядзельскі, Бабруйскі, Мінскі, Жодзінскі, Барысаўскі, Смалявіцкі, Дзяржынскі, Валожынскі, Вілейскі, Астравецкі, Маладзечанскі раёны.

— Ёсць пытанні? Пажаданні? Сумненні? Тады размяркоўваемся? — цікавіцца ў чарговага выпускніка прадстаўнік камісіі.

Усе пяцікурснікі пагаджаюцца і пакідаюць свае подпісы ў ведамасці.

## ПАЧУЦЬ КОЖНАГА

Адна дзяўчына родам з Гродна робіць выбар на карысць Жодзінскага раёна. Прызнаецца, што едзе за сваім маладым чалавекам. Камісія яе жаданне задавальняе. Другая выпускніца замест размеркавання ў Мінскі раён просіць размеркаваць яе ў Мінск — у школу ў Фрунзенскім раёне. Тлумачыць, што позна зрабіла рэгістрацыю ў сталіцы, але запыт са школы ў яе ёсць.

— Паколькі студэнтка ўжо працуе ў школе год, маладую настаўніцу ведаюць і дзеці, і калегі, то чаму б нам не пайсці ёй насустрач, — разважаюць члены камісіі.

Яшчэ адна выпускніца просіць замяніць размеркаванне ў Нясвіжскі раён размеркаваннем у Дзяржынскі раён. «Купцы», якія асабіста прысутнічаюць на размеркаванні, пацвярджаюць сваю зацікаўленасць, кажуць, што «ахвотна яе забіраем». І гэта просьба, агучаная адразу з двух бакоў, камісіяй задавальняецца.

А вось мінчанка Таццяна размяркоўваецца ў Чэрвеньскі раён. Кажа, што гэта яе асабісты свядомы выбар... Дзяўчына з Карэліцкага раёна размяркоўваецца ў жодзінскую школу. «А як жа ваша радзіма?» — цікавіцца ў яе члены камісіі. «На гэты раз без мяне...» — жартуе студэнтка. «Мы не супраць».

ж мой наймальнік абяцае забяспечыць мяне жыллём у інтэрнаце і, адпаведна, рэгістрацыяй па месцы пражывання. Я сама не мінчанка, таму для мяне гэта важны бонус.

**На 134 выпускнікі факультэта дашкольнай адукацыі паступіла 778 заявак, а на 76 выпускнікоў факультэта пачатковай адукацыі было 340 заявак.**

Хтосьці размяркоўваецца ўслед за мужам, таму ніякіх пярэчанняў з боку камісіі няма. Выпускніцы спецыяльнасці «Фізіка. Тэхнічная творчасць», у якой у Мінску ёсць сям'я і дзіця, таксама ідуць насустрач. Хоць планавых месцаў у сталіцы па яе профілі падрыхтоўкі пакуль няма, але яе ўсё ж такі размяркоўваюць у Камітэт па адукацыі ў Мінску. Яшчэ аднаму мінчаніну прапануюць размеркаванне або ў Камітэт па адукацыі (адкуль пакуль няма запытаў), або, калі ён пажадае, у Смалявічы, дзе яго рады будуць бачыць.

Выпускнікі, якія разбіраюцца ў інфармацыйных тэхналогіях, ахвотна забірае і родны ўніверсітэт: працаваць інжынерамі-праграмістамі на кафедру інфарматыкі або ў Цэнтр па развіцці інфармацыйных тэхналогій (у аддзел электронных дакументаў). А ў аднаго з пяцікурснікаў першым працоўным месцам стане Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі, дзе ён будзе займацца экспертызай электронных сродкаў навучання прыродазнаўча-навуковага цыкла.

— Вы там ужо працавалі? Тады поспехаў вам. Не падвядзіце, — кажуць свайму выпускніку члены камісіі.

«Найлепшых людзей аддаём, сярэдні бал 8,4», — гэта ўжо словы ў падтрымку студэнткі, якая размяркоўваецца ў адну з мінскіх школ.

«Ці падабаецца вам будучая работа?» — цікавіцца Валерый Зелянкевіч у наступнай студэнткі і чуе ў адказ: «Вельмі».

## ХТО Ў ДЭФІЦЫЦЕ?

**Начальнік аддзела кадраў БДПУ Валерый АЛАВЯННІКАЎ** расказаў, што ў гэтым годзе на 721 выпускніка дзённай бюджэтнай формы навучання ўніверсітэт атрымаў 2289 заявак! Па некаторых спецыяльнасцях універсітэт забяспечвае патрэбу сваіх асноўных заказчыкаў — устаноў адукацыі Мінска і Мінскай вобласці — менш чым напалову. У іншых рэгіёнах размяркоўваецца невялікая колькасць выпускнікоў — ад 3 да 5 працэнтаў, паколькі ў кожным абласным цэнтры ёсць свае ўніверсітэты.

Яшчэ колькі гадоў таму самымі дэфіцытнымі ў сістэме адукацыі былі настаўнікі фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, але сітуацыя кардынальна змянілася, і сёння катастрафічна не хапае настаўнікаў пачатковай школы і выхавальнікаў дашкольных устаноў. Так, на 134 выпускнікі факультэта дашкольнай адукацыі паступіла 778 заявак, а на 76 выпускнікоў факультэта пачатковай адукацыі было 340 заявак.

— Прашу заўважыць, што цяпер магчымасць працаўладкавання ў Мінску і абласных цэнтрах не залежыць ад наяўнасці рэгістрацыі ў гэтых населеных пунктах, а вызначаецца толькі самім наймальнікам, — падкрэслівае Валерый Алавяннікаў. — Мы нікому не адмаўляем у размеркаванні ў Мінск на той падставе, што чалавек родам з іншых месцаў. Гэта яго права. Выпускнікі самі ацэньваюць свае магчымасці на самастойнае дарослае жыццё ў сталіцы. Добра, калі наймальнік бярэ на сябе абавязацельства забяспечыць маладога спецыяліста жыллём. А калі ў яго няма такой магчымасці? І многія, цвяроза ацаніўшы свае шанцы, вяртаюцца на радзіму, бліжэй да бацькоўскага дому...

Адзін з прынцыпаў работы камісіі па размеркаванні — зрабіць усё для таго, каб працоўная дзейнасць выпускнікоў пачыналася ў максімальна камфортных для іх умовах. Натуральна, не парушаючы пры гэтым заканадаўства.

— Мы лічым, што перспектывы ўпісацца ў педагагічны калектыў і застацца ў сістэме адукацыі надоўга залежаць ад таго, расчыніла школа свае дзверы перад выпускніком або толькі прыадчыніла. Проста выдатна, калі выпускнік размяркоўваецца ў школу, дзе ён праходзіў педагагічную практыку або ўжо працаваў там настаўнікам, у камфортную псіхалагічную атмасферу. Гэта вельмі спрашчае адаптацыйны перыяд. Ва ўсіх выпускнікоў была магчымасць выбіраць з некалькіх варыянтаў, усё абдумаць з улікам сваіх сямейных абставін і прыняць найбольш узважанае рашэнне. Патэнцыяльныя наймальнікі выходзілі на кіраўніцтва факультэтаў, нагледжвалі для сябе будучых спецыялістаў, удзельнічалі ў папярэднім размеркаванні, спрабуючы зацікавіць студэнтаў выпускнога курса. А паколькі ёсць выбар, то і праблемы адсутнічаюць. Настаўнік — вельмі запатрабаваная прафесія. І яна будзе такой заўсёды.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

■ Кампус

# Балонскі працэс: новыя магчымасці для вышэйшай школы

**Пытанне аб уключэнні Беларусі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі будзе абмеркавана на пасяджэнні міністраў адукацыі краін агульнаеўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі 14-15 мая ў Ерэване. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі нашай краіны. Міністр адукацыі Міхаіл Журавкоў атрымаў афіцыйнае запрашэнне для ўдзелу ў мерапрыемстве.**

Нагадаем, што ідэя стварэння еўрапейскай універсітэцкай супольнасці і адзінай еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі належыць найстарэйшаму ў Італіі Балонскаму ўніверсітэту. Яшчэ ў 1986 годзе, рыхтуючыся да свайго 900-гадовага юбілею, кіраўніцтва ўніверсітэта звярнулася да ўсіх універсітэтаў Еўропы з прапановай прыняць Вялікую хартыю ўніверсітэтаў — MagnaChartaUniversitarum. Ідэя была з энтузіязмам успрынята ВНУ, і падчас юбілейных урачыстасцяў у 1988 годзе гэты дакумент, які абвяшчае ўніверсальныя і вечныя каштоўнасці ўніверсітэцкай адукацыі, а таксама неабходнасць цесных сувязяў паміж імі, быў падпісаны рэктарамі 80 ВНУ.

У 1999 годзе на радзіме MagnaCharta ў Балонні адбылася першая канферэнцыя трыццаці еўрапейскіх міністраў адукацыі. Прынятая імі дэкларацыя «Зона еўрапейскай вышэйшай адукацыі» вызначыла асноўныя мэты, якія вядуць да зблiжэння і гарманізацыі нацыянальных адукацыйных сістэм вышэйшай адукацыі ў краінах Еўропы і павышэння канкурэнтаздольнасці еўрапейскай вышэйшай школы.

Балонскі працэс стварае спрыяльныя ўмовы для максімальна спрошчанага перамяшчэння студэнтаў і ўладальнікаў дыпломаў у межах агульнай адукацыйнай прасторы, спрашчае ўзаемнае прызнанне кваліфікацый і адпаведных дакументаў аб вышэйшай адукацыі, спрыяе ўзаемадзеянню паміж ВНУ ў адукацыйнай і даследчай дзейнасці і гэтак далей. Адна з галоўных пераваг Балонскай ідэі — магчымасць больш рацыянальна выстраіць усемагчымыя адукацыйныя траекторыі. Балонскі працэс прапануе варыянт універсітэцкай адукацыі, які адпавядае патрэбам сучаснага тэхналагічнага ўкладу.

Балонскі працэс адкрыты для ўсіх краін, якія жадаюць у ім удзельнічаць, таму імкненне Беларусі, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, стаць яго часткай, цалкам лагічнае і натуральнае.

Сёння Балонскі працэс аб'ядноўвае ўжо 47 краін. Расія далучылася да Балонскага працэсу ў 2003 годзе, Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова і Украіна — у 2005-м, а Казахстан — у 2010-м.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

---

■ Даты!

# «ПАКЛОН, МАТУЛЯ, НІЗКІ-НІЗКІ!..»



Ніна Віктараўна МЯЛЕШЧЫК з унучкай і праўнукам.

**Больш за сорак гадоў Ніна Віктараўна Мялешчык адпрацавала ў Дабраводскай пачатковай школе. Спачатку — настаўніцай, потым — дырэктарам. За гэты час пуцёўкі ў дарослае жыццё атрымалі тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак, тысячы «яе дзяцей».**

Сярод іх, у пасляваенныя гады напаўгалодных, а то і галодных, была і... пяцёрка родных, якіх, рана страціўшы мужа, Ніна Віктараўна гадавала і выхоўвала адна — добрасумленна і адказна працуючы, трымаючы гаспадарку, будуючы дом... Як яна змагла, чаго ёй гэта каштавала, можна толькі здагадвацца... А яшчэ — распытваць: 17 красавіка Ніне Віктараўне спаўняецца 90!

*Паклон, матуля, нізкі-нізкі!*
*Няхай увесь пачуе свет:*
*Ты самы любы, самы блізкі,*
*Ты самы родны чалавек!..*

**Напісаў гэтыя радкі адзін з сыноў Ніны Віктараўны — Сяргей. Астатнія — далучаюцца!**

# ЗАКРАНАЮЧЫ СТРУНЫ ДУШЫ

## Анатоль Длускі — пра феномен аўтарскай песні, новае пакаленне беларускіх бардаў і любімую гітару

**Тым, хто рос і сталеў у Савецкім Саюзе, не трэба тлумачыць, хто такія барды і што ёсць аўтарская песня, бо гэтыя некалькі пакаленняў добра ведаюць не толькі імёны, але і творчасць Уладзіміра Высоцкага і Булата Акуджавы, Юрыя Візбара і Аляксандра Галіча, дуэта Таццяны і Сяргея Нікіціных, Веранікі Долінай і Навелы Матвеевай... Вялізныя клубы аўтараў-выканаўцаў, турыстычныя злёты, маштабныя фестывалі аматараў бардаўскай песні — у гады СССР і постсавецкі час гэты пласт культуры квітнеў і развіваўся, нягледзячы ні на якія забароны. Для цяперашніх жа меламанаў многае з пералічанага — ужо далёкая гісторыя. Больш за тое, значная частка не толькі сучаснай моладзі, але і людзей сталага веку чамусьці ўпэўнены: «няма таго, што раньш было», а барды ў нас калі і засталіся, то хопіць пальцаў адной рукі, каб іх пералічыць. Каб пераканацца, што гэта, мякка кажучы, не зусім так, дастаткова звярнуць увагу на праект, запушчаны летась тэлеканалам «Беларусь 3» — музычна-пазнавальную праграму «Подых струн», прысвечаную менавіта аўтарскай песні.**



Першапачаткова і ў гледачоў, і ў саміх тэлевізійнікаў была пэўная насцярожанасць: а раптам пацыент хутчэй мёртвы, чым жывы, і ніхто з сучаснікаў на гітарныя пераборы не падцягнецца? Аднак з верасня мінулага года, калі праект толькі выйшаў у эфір, колькасць прэтэндэнтаў на ўдзел у ім не толькі не зменшылася, а вырасла ў разы. І, як прызнаюцца прадзюсары, а таксама вядучы праграмы, акцёр і аўтар-выканаўца Анатоль Длускі (сам далёка не навічок у свеце аўтарскай песні), яны нават не чакалі такой вялізнай аддачы і адкрыцця дзясяткаў новых імёнаў!

**Мне б не хацелася праводзіць галасаванне для вызначэння найлепшых, бо пераможцы, пераможаныя — гэта не наша гісторыя.**

***— Звярнула ўвагу, што сярод вашых гасцей пераважна сталыя людзі — маладых аўтараў-выканаўцаў, кшталту Таццяны Белаunion гай або Паліны Рэспублікі, зусім няшмат. Гэта выпадковасць або свядомы «адбор» суразмоўцаў з пэўным жыццёвым багажом, з якімі цікавей весці гутарку?***

— Гэта адбываецца зусім не наўмысна, да таго ж, і сярод маладых выканаўцаў ёсць вельмі цікавыя суразмоўцы, напрыклад, Яўген Барышнікаў са Слоніма — хлопец, які піша вершы ў маршрутцы. Вельмі незвычайны чалавек: ён і дудар, і ўдзельнік этнаграфічных экспедыцый, і аўтар-выканаўца беларускамоўных песень. Прычым гэта не проста замалёўкі, якія добра спяваць пад гітару ля вогнішча, а вялікія балады ў адметнай стылістыцы. ...Шчыра кажучы, калі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька прапанаваў мне весці гэтую перадачу, я таксама, як многія, сказаў: «Дык у нас жа бардаў няма!» Здаецца, з кім я пачынаў 30 гадоў таму, тыя ж і засталіся ў гэтым коле, а новых імёнаў не чуваць і не відаць. Але, на маю радасць і шчасце, у Беларусі ёсць столькі таленавітай моладзі, столькі самабытных, непадобных адзін да аднаго выканаўцаў!

***— За той час, што выходзіць праграма, вам удалося для сябе вызначыць, што гэта за феномен — бардаўская песня?***

— «Бард», наогул, не наша слова, для мяне бліжэйшае паняцце «аўтарская песня». Бо барды, на маю думку, гэта своеасаблівыя рэвалюцыянеры, хто нясе праз музыку новыя думкі і спадзевы, чыя творчасць адкрывае іншым вочы, розум і сэрцы. Магчыма, у мяне самога быў падобны вопыт: некалі за песню «Маналог сучаснага мешчаніна», якая намякала на «прыгрэтых» чыноўнікаў, аднаму майму знаёмаму з камсамольскіх лідараў зрабілі вымову, а мне на год забаранілі выступаць у Мінску, пры тым што на канцэртах гэту песню прымалі на ўра, з захопленым ровам і стогнам... А аўтарская песня — паняцце больш шырокае, у яго могуць увaходзіць і акцёры, як я сам, і журналісты, і прафесійныя спевакі, якія самі пішуць песні... Асновай аўтарскай песні, мяркую, мусяць быць найперш вершы, добры тэкст, музыка тут — справа другасная.

У праграме вельмі доўгі час ішлі дыскусіі — усё ж жыве ці не жыве бардаўская песня. На мой погляд, гэта пытанне наогул не павінна гучаць: пакуль мы сумняваемся, значыць, не жыве. Але колькасць і разнастайнасць выканаўцаў гэтага кірунку сведчыць, што ўсё тут у парадку. Іншая справа, якім будзе далейшае развіццё. Адказ мы шукаем у кожнай праграме. Безумоўна, час дыктуе свае ўмовы, і тая лёгкасць, празрыстасць і душэўнасць «класічнай» аўтарскай песні, якая была запатрабавана раней, трансфармуюцца ў штосьці новае.

***— Праект «Подых струн» адкрыў для шырокай публікі шэраг новых імёнаў. Але ў вас у гасцях былі і вядомыя прафесійныя музыканты: той жа Пётр Ялфімаў, рокер Піт Паўлаў, блюзмен Андрэй Плясанаў і іншыя. Ці раскрыліся яны з нейкага новага боку?***

— Бясспрэчна. Больш за тое, многія музыканты жадаюць паказаць гледачам нейкія рэчы, што пішуцца «ў стол», тэлефануюць і просяцца: «Вазьміце мяне!» Андрэй Плясанаў сапраўды здзівіў, напрыклад, тым, як ён пераклаў на беларускую мову Высоцкага... Або Юрый Несцярэнка з Бялынічаў, які выконвае на беларускай песні "Машыны часу" (яго пераклад, між іншым, Андрэй Макарэвіч ухваліў і даў «дабро» на выкананне)! Некаторыя спытаюцца: «Ды навошта гэта трэба?» А на мой погляд, вельмі добрая ідэя, чаму б не?

Для мяне найлепшае сведчанне таго, што праграма цікавая і гледачам, і самім музыкам, — ацэнкі, якія чую па-за эфірам. Усе ж кажуць: «Ой, я не гляджу беларускае тэлебачанне». А пры сустрэчы заўважаюць, як ім спадабаўся ці не спадабаўся пэўны выпуск. Я неяк пайшоў на мастацкую выставу, так літаральна адбою не было ад знаёмых, якія жадалі падзяліцца ўражаннямі. Ядзя Паплаўская беглa праз усю залу, каб толькі сказаць: «Толічак, я выпадкова ўключыла тэлевізар і «падсела» на тваю праграму, цяпер чакаю кожны выпуск!»

***— Загаварылі пра пераклады на беларускую мову, і я згадала, што «зачапіла» яшчэ ў першых выпусках праграмы — гэта двухмоўе, калі вядучы звяртаецца да героя на рускай, а той спявае і адказвае па-беларуску. Вам асабіста ў гэтай сітуацыі камфортна ці няёмка?***

— Скажу так: я размаўляю па-беларуску досыць добра, але калі нехта з гасцей размаўляе нашмат лепш і гэта вельмі адчуваецца, то, каб не глуміцца з матчынай мовы, пераходжу на рускую. Хаця яшчэ калі я вучыўся ў школе, у нашай вёсцы ўсе прадметы выкладаліся па-беларуску, і багаж застаўся неблагі, але ў тэатральным інстытуце, наадварот, муштравалі, каб прыбраць з маўлення гэтыя «гэ», «чы», «ры»... Думаю, усё ж трэба арыентавацца на госця — я на 100% за тое, каб з беларускамоўным аўтарам весці гутарку па-беларуску, мне і самому так больш даспадобы.

***— «Подых струн» — даволі вузкі, нішавы праект, і былі пэўныя перасцярогі, што атрымаецца праграма «музыкі для музыкаў». Але водгукі на сайце, у сацыяльных сетках, СМС-паведамленні ў эфіры сведчаць, што гледачы зацікавіліся і прыняплі праграму. Ці прапануюць штосьці змяніць або ў асноўным робяць кампліменты?***

— Сам здзіўляюся, але пакуль у асноўным хваляць і прапануюць кандыдатуры новых герояў. Хоць, безумоўна, заўжды хочацца зрабіць яшчэ лепш і прыдумаць нешта новае. Напрыклад, я цяпер напрыканцы праграмы спяваю — такім чынам і ўвагу ад госця не адцягваю, і выконваю просьбы часткі гледачоў, якія прапанавалі даць нарэшце слова і вядучаму. З часам, як мне бачыцца, праграму можна запісваць у студыі са слухачамі, каб яны маглі адразу жыва рэагаваць на песні, задаваць свае пытанні і г.д. Не страшна, што на расійскім тэлебачанні ў свой час была падобнага фармату перадача «У нашу гавань заходзілі караблі» — мы ж прапагандуем сваё, беларускае, таму зрабілі б па-іншаму. Хоць, зразумела, на гэта патрэбны сродкі, адпаведная пляцоўка і іншыя пэўныя ўмовы, што не ад нас залежаць. Галоўнае, каб усімі новаўвядзеннямі не збіць той самы далікатны настрой, атмасферу аўтарскай песні. Я ў гэтым сэнсе вельмі прыдзірлівы крытык, здараецца, абмяркоўваем са здымачнай групай, рэжысёрам і рэдактарам чарговыя выпускі — усё як быццам добра, але ўласныя недапрацоўкі я бачу і стараюся выправіць. Зрэшты, з цягам часу мне ў праграме стала цікава ўсё: ад кожнай дробязі атрымліваю задавальненне і надаю ёй увагу. Пэўна, я таксама «падсеў» на праграму *(смяецца)*.

**...Шчыра кажучы, калі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька прапанаваў мне весці гэтую перадачу, я таксама, як многія, сказаў: «Дык у нас жа бардаў няма!»**

***— У перадапошнім выпуску, памятаю, быў зроблены гэткі зборнік найлепшых песень па выніках галасавання гледачоў. А што далей — можа, запіс зборнага дыска альбо выязны фестываль?***

— Мне б не хацелася праводзіць галасаванне для вызначэння найлепшых, бо пераможцы, пераможаныя — гэта не наша гісторыя. Але адзначыць найбольш упадабаныя гледачамі песні, магчыма, было б варта. Няблага было б паспрабаваць зладзіць канцэрты...

***— Прычым не ў сталіцы, дзе публіка «перакормлена» разнастайнымі артыстамі, а ў правінцыі, дзе слухачы не спешчаны частымі канцэртамі. Ды хоць бы ў вашай роднай вёсцы Туча ў Клецкім раёне.***

— Можа быць. Тое, што людзі пайшлі б з задавальненнем — гэта нават не пытанне, толькі прывязі артыстаў! Усё, як заўжды, упіраецца ў арганізацыю. Але мы сапраўды думаем над гэтым пытаннем. Прадзюсар нашай праграмы Алена Манькоўская прапанавала ідэю: праехаць з канцэртамі па абласных гарадах, каб у першым аддзяленні выступалі мясцовыя барды, у другім спяваў я. Вельмі хацелася б, каб гэта атрымалася.

***— Пачатак, можна сказаць, пакладзены: гэтай зімой Белтэлерадыёкампанія зладзіла першы тэлевізійны фестываль бардаўскай песні «Свяча гарэла...». Ці атрымае ён працяг?***

— Гэта было менавіта такое зімовае мерапрыемства, якое ініцыяваў, дарэчы, зноў жа старшыня тэлекампаніі Генадзь Давыдзька. Атрымалася не так, як бывае, «першы блін комам», а былі вельмі шчырыя, утульныя «пасядзелкі», гэткая аддушына. Я ўвогуле прыкмячаю, што апошнім часам такія некамерцыйныя, крыху забытыя рэчы — старыя песні, старыя фільмы — быццам набываюць другое жыццё і карыстаюцца павышанай папулярнасцю. Калі ўсё будзе добра, я ўжо ўяўляю, як гэта можна зрабіць наступнай зімой, каб засталося тое самае ўзнёслае і рамантычнае, нягучнае і сапраўднае, што сапраўды яднае розных людзей. На лета ж, як плануецца, мы паедзем у госці па лясных фестывалях аўтарскай песні, а самымі яркімі ўражаннямі адтуль абавязкова падзелімся з гледачамі ў эфіры.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




### ВЕЛЬМІ АСАБІСТАЕ

***— Бард, незалежна ад таго, хто ён і пра што спявае, — гэта найперш чалавек з шасці- або сямістрyннай гітарай. Ведаю, што ў вас сабралася цэлая калекцыя такіх інструментаў. Якая гітара самая любімая?***

— Ну, не тое каб калекцыя — у мяне шэсць гітар. Самая любімая — чырвоная, яна, дарэчы, пастаянна стаіць у кадры «Подыху струн». Гэта мая самая сапраўдная, верная, баявая сяброўка — дзе толькі мы разам ні былі! На Байкале аднойчы яе разбілі ўшчэнт, потым літаральна сабралі па кавалачках... І дагэтуль, калі кудысьці трэба «на выезд», я бяру яе з сабой. У самай першай маёй гітары, якую набыў яшчэ ў студэнцкія гады, ёсць своеасаблівая «радзімая плямка»: робячы ў ёй нейкі дробны рамонт, выпадкова прыклеіў птушынае пяро, і яно так прыгожа застыла... Аднойчы, калі ехаў з Масквы на пракладных дадому, заснуў у электрычцы і гітара мая з'ехала ў Пухавічы. Паехаў на канцавую, у дэпо — шукаць, заходжу да дзяжурнага, расказваю, што так і так, пакінуў у электрычцы гітару. «А як вы дакажаце, што гэта ваша?» — пытаецца строгі дзяжурны. Я і кажу: «У яе ёсць асаблівая прыкмета — пёрка ў клеі». — «Глядзі ты, сапраўды... Ну, забірай». Цяпер яна стаіць у мамы, і часам спяваю для яе. Усе астатнія гітары захоўваюцца тут, у Мінску.

# АЎТОРАК, 21 КРАСАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**7.25** Кінаанонс «Дзяўчынка шукае бацьку».
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Слова Мітрапаліта Паўла на Радаўніцу.
**9.25 Рэтрадрама «Я цябе люблю...».**
**11.05 Дэтэктыў «Забіць Сталіна». 4-я — 8-я серыі.**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**17.15** Нашы.
**17.30 Меладрама «Я побач». 1-я — 4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00 Меладрама «Кроўныя вузы». 1-я і 2-я серыі.**
**1.30** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**6.30 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**10.55, 21.25** Тэлебарометр.
**11.00** Беларуская кухня.
**11.35 Меладрама «Мой восеньскі блюз».**
**13.30 Фільм-катастрофа «Тытанік».**
**16.45 Баявік «Хуткасць».**
**18.50 Баявік «Хуткасць 2: Аўтапілот».**
**21.00** Цела чалавека.
**21.30** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. «Баварыя» — «Порту». Матч у адказ.
**23.50 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.15 Серыял «Быць чалавекам».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.15, 18.50, 0.30** Калейдаскоп.
**8.10, 13.25, 19.00** «Размовы пра духоўнае».
**8.20** «Беларускі народны каляндар. Радаўніца».
**8.30, 17.55 «Гісторыя Тома Джонса Знайдыша». Драма.**
**9.25 «Спакуса». Меладрама.**
**10.50, 17.25, 21.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**11.20 «Палёты ў сне і наяве». Драма.**
**12.45, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака Беларусі Валянціна Волкава.
**13.35 «Калі можаш, даруй...». Меладрама.**
**14.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**15.25** «Персона». Эдзіта П'еха.
**15.50 «Гваздзік». Драма.**
**16.35** «Вечар памяці тэлежурналіста Аляксандра Чуланава».
**17.50** «Размаўляем па-беларуску».
**19.10 «Даніїл — князь Галіцкі». Драма.**



**20.45** Калыханка.
**21.30 «Усё пачалося ў Харбіне». Драма. 1—3-я серыі.**
**0.15** «Персона». Анастасія Мельнікава.

## БЕЛАРУСЬ 5

**6.30, 5.50** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**8.10** Час футбола.
**8.50** Футзал. Чэмпіянат свету. Групавы этап. Беларусь — Аўстралія.
**9.55** Футзал. Чэмпіянат свету. Групавы этап. Уругвай — Бразілія.
**10.55, 2.35** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**13.00** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт.
**17.55** Футзал. Чэмпіянат свету. Групавы этап. Бельгія — Нарвегія.
**19.20** Хакей. КХЛ. Фінал. Шосты матч. СКА — «Ак Барс».
**21.40, 0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Матч у адказ.
**23.40** Футзал. Чэмпіянат свету. Групавы этап. Парагвай — Марока.
**4.55** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**7.00** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/ф.
**9.20 Маст. фільм «Белыя росы».**
**10.55 Маст. фільм «Белыя росы. Вяртанне».**
**12.50, 16.20 Маст. фільм «Нябесны суд».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.50 Маст. фільм «Нябесны суд. Працяг».**
**21.05** «Вайна машын».
**21.40 Маст. фільм «Выгнанне».**

## СТБ

**6.10** «Дакументальны праект»: «Душа ў спадчыну», «Здольнасці, якія не прымяняюцца».
**7.50 Маст. фільм «Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана».**
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Дакладны сродак».
**14.45, 23.10 Серыял «Сустрэчная плынь».**
**16.40** «Тайны свету».
**18.30, 1.30 Серыял «Мяжа часу».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.05 Маст. фільм «Пра Шміта».**
**22.15** «Дакументальны праект»: «Рай асуджаных».
**0.40** «Дакументальны праект»: «За гарызонтам часу».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.25 Маст. фільм «Цыганскае шчасце».**
**10.55 Маст. фільм «Палёт. Тры дні пасля катастрофы».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20** Дак. серыял «Дом без ахвяр».
**14.10 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**21.15, 23.15 Серыял «Дашнікі».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Гарачая тэма.
**1.30** Прафілактыка на тэлеканале.

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Маст. фільм «Былінка на ветры».**
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**16.50** «Факты».
**17.10 Серыял «Апошні янычар».**
**18.00** «Асаблівы выпадак».
**18.55** «Гісторыя нораваў. Вялікая французская рэвалюцыя».
**20.55 Серыял «Чужое жыццё».**
**21.55 Серыял «Скліфасоўскі».**
**23.50** «Гісторыя нораваў. Напалеон I».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05** «Справа ўрачоў».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45, 22.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Усё будзе добра!».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Ляснік».**
**21.25 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**22.45** «Анатомія дня».
**23.40 Серыял «Другі забойны».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.00, 19.45, 21.00, 23.15** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.15, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.35, 18.35 Серыял «Радзіма».**
**9.25, 13.45, 15.45, 16.55, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30, 23.20** «Хобі TV».
**11.00 Драма «Ілюзіяніст».**
**12.50** Дак. серыял «Кошак не любіць нельга».
**13.40** «Кінаблакнот».
**14.05 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.05 Серыял «Дарагі доктар».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Камедыя «Пякельны хмарачос».**



**22.50 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**

## ■ Ваенкіно

# СКАЗ ПРА СНАЙПЕРМЕНАЎ

**Недзе пяць гадоў таму беларускія і расійскія кінавытворцы аб'ядналі сілы дзеля стварэння ваеннага баевіка ў стратэгічным, як кажуць, для беларускага кіно і нацыянальнай кінастудыі рэчышчы — тэме Вялікай Айчыннай. З чаго атрымаўся эпічны фільм «Снайпер. Зброя адплаты» з расійскім акцёрам Дзмітрыем Пяўцовым у галоўнай ролі. Вайна, каханне, помста, стрэлы «ў яблычак» і драматычнае перажыванне жалезна паставілі фільм у спіс самых папулярных праграм расійскага тэлебачання пасля яго прэм'еры.**



У цэнтры карціны, якая існуе ў версіях фільма і міні-серыяла, два часы і месцы дзеяння — Сталінград 1941 года і нямецкі гарадок ужо ў 1945-м. Вайна і яе наступствы. У цэнтры карціны прыгожы, мужны, меткі снайпер і відавочны лідар Яшын (Дзмітрый Пяўцоў), камандзір групы з дзевяці прафесійных снайпераў. Супрацьстаяць небяспечным савецкім стралкам нямецкае камандаванне адпраўляе свайго прафесіянала — капітана Карла Кляйста. У абставінах вонкавай небяспекі і, вядома ж, вайны ўнутры групы снайпераў развіваюцца простыя чалавечныя пачуцці і неслабыя страсці. У Яшына закахалася калега Алеся (расійская актрыса Аліна Сяргеева).

Усе ніткі вядуць да пераломнага моманту, часу «Х», калі напружанне эпізодаў дасягае ўзроўню сапраўднага саспенсу. Уявіце. Разваліны разбітага ваеннымі баямі дома, пустыя вокны, за якімі хаваецца небяспека. І старшы лейтэнант Яшын нутром гэта адчувае. У гэты напружаны момант Алеся са слязьмі на вачах узрушана прызнаецца Яшыну ў каханні і кажа, што ў яе нікога не засталося і без каханага яна не зможа жыць. У гэты ж час за парай пільна сочыць Карл Кляйст. Алеся плача. Яшын праз прыцэл разведвае абстаноўку. І нарэшце не вытрымлівае, кідае сваю мужчынскую сілу волі і, не зважаючы на небяспеку, кідаецца да Алесі.

Стрэл. Гэта Кляйст, які дастаткова імпазантна змагаецца з савецкімі ворагамі і псіхалагічна разлічвае сваю тактыку такім чынам, каб у момант яднання двух закаханых забіць дзяўчыну і пакінуць Яшына аднаго.

Патавая сітуацыя — толькі штуршок, і ў гэтым выпадку смерць — толькі пачатак фільма і яго каталізатар. Калі дзеянне пераносіцца ў Германію 1945 года — дыспазіцыя памяняецца: ужо маёр Яшын стане камендантам невялікага нямецкага горада, і яму зноў давядзецца сустрэцца з Карлам Кляйстам.

Пагліядзіце, хто каго пераможа.

У фільме «Снайпер. Зброя адплаты» — бясспрэчная палярызацыя сіл і герояў. Карл Кляйст можа наваг не адкрываць рот і не прамаўляць нямецкія словы — у адным яго выглядзе, створаным акцёрскай сілай, відаць фашысцкая сутнасць (яго іграе немец Ёахім Паўль Асбёк). У той час, як яго антаганісту Яшыну ўласцівыя сапраўдная мужнасць, чалавечнасць і драматычнае мінулае, якое прымушае прасякнуцца да яго сапраўдным глядацкім спачуваннем і суперажываннем.

Акцёрскі склад карціны ў асноўным беларуска-расійскі. Рэжысёрам стаў Аляксандр Яфрэмаў, сцэнарый напісаны Глебам Шпрыгавым.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■

## ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**9.00, 13.45** Серыял «Ералаш».
**10.00, 0.00** «Турбаміксер».
**12.00, 2.00** Прыгоды «Нэверлэнд». Серыя 2.
**14.00, 18.00** «Уральскія пельмені».
**15.00** Баявік «Бой з ценем 3: Апошні раўнд».
**17.30, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**18.00** Камедыя «Уцекачы».
**20.00** Фантастыка «Пяты элемент».
**22.45, 3.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15, 23.20** «Сланечнікі». Маст. фільм.
**13.05, 20.30** «Правілы жыцця».
**13.30** «Эрмітаж- 250».
**14.05** «Пецярбургскія тайны». Серыял.
**15.10** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Хлопчыкі дзяржавы. Міхаіл Кульчыцкі».
**15.40** «Саці. Нясумная класіка...».
**16.20** «Метафізіка святла. Аляксандр Анціпенка». Дак. фільм.
**17.05** «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі». Дак. серыял.
**17.45, 1.05** Да 175-годдзя з дня нараджэння П.І. Чайкоўскага. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам. В. Трацякоў, Д. Кітаенка і Акадэмічны сімфанічны аркестр Маскоўскай філармоніі.
**18.30** «Твая Вялікасць — Політэхнічны!». Дак. фільм.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Штучны адбор.
**20.15** «Добрай ночы, малыя!».
**21.00** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Мая вялікая вайна. Сумбат Сумбатаў». Дак. фільм.
**21.35** «Напісана вайной» Андрэй Ташкоў чытае верш К. Сіманава «Ты казала мне «кахаю»...».
**21.40** «Гульня ў бісер». «А.І. Купрын. «Паядынак».
**22.20** «Эдуард Мане». Дак. фільм.
**22.30** «Тыя, з якімі я... Рычард Гір». Частка 2-я.
**1.45** «Эрнэст Рэзерфорд». Дак. фільм.
**2.00** Прафілактыка на тэлеканале.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Юрый Антонаў. 1995 год.
**6.40, 7.10, 8.45, 10.40, 11.25, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 17.40, 19.00, 20.35, 21.40, 23.00, 23.35, 1.05, 1.30, 2.40, 3.50, 5.45** Музычная настальгія.
**7.00, 1.20** М/с «Болек і Лёлек».
**7.30, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**9.10** Маст. фільм «Ар-хі-меды!».
**11.10** М/ф «Як казакі іншапланецян сустракалі».
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
**13.20** Маст. фільм «Вертыкаль».
**14.45** М/ф «Залатарогі алень».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**17.30, 23.30** «Прэс-экспрэс». 1993 год.
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». А. Хвасценка. 2006 год.
**19.20** Маст. фільм «Цягнік па-за раскладам».
**20.45** М/ф «Чарадзейныя акуляры».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1958-ы. 2-я частка. Паўтор ад 13.03.2010 года.
**1.50** «Спяем, сябры» з Таццянай Візбар. Трыа «Мерыдыян». 2008 год.
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.10** Маст. фільм «Гарадскі раманс».

## EUROSPORT

**9.30** Барацьба. Кубак свету.
**10.00, 15.00** Футбол. Еўрагалы.
**10.45** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
**11.00, 16.30, 1.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.45** WATTS.
**0.00** Мотагонкі.
**0.30** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**1.00** Мотакрос. Чэмпіянат свету.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.55, 17.50, 22.00, 0.55** Серыял «Сваты».
**6.55** Камедыя «Дзякуй тата, дзякуй мама».
**8.25** Камедыя «Я буду дома да Каляд».
**10.50** Камедыя «Мамчын сынок».
**12.30** Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.15, 22.50** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Блізнюк».
**18.45** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**20.20** Камедыя «Татулі».
**23.10** Камедыя «Спатканне ўсляпую».
**2.00** Прафілактыка.

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.30, 23.15, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**11.30** Маст. фільм «Чалавек каля акна».
**13.15, 0.50** Маст. фільм «Амерыканская трагедыя».
**18.20** Дак. серыял «Калі адыходзяць каханыя».
**19.50** Маст. фільм «Біццё сэрца».
**0.05** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

## ТБ1000

**7.15** Трылер «Пакой страху».
**9.15** Баявік «Гісторыя рыцара».
**11.30** Трылер «Прывід».
**13.40** Фантастыка «Місія «Сераніца».
**15.40** Баявік «Прылады смерці: Горад касцей».
**17.55** Драма «Машына Джэйн Мэнсфілд».
**20.00** Драма «Тэорыя змовы».
**21.55** Камедыя «Развод па-амерыканску».
**23.40** Драма «12 гадоў рабства».
**2.00** Камедыя «Я не ведаю, як яна робіць гэта».
**3.35** Камедыя «Атэль рамантычных спатканняў».
**5.15** Камедыя «Людзі ў чорным 2».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Баявік «Канец аперацыі «Рэзідэнт».
**8.45** Драма «Час пік».
**10.35** Фантастыка «Паляўнічы».
**12.20** Камедыя «Бакенбарды».
**14.05** Баявік «Код апакаліпсіса».
**15.55** Баявік «Бой з ценем».
**18.05** Драма «Дуброўскі».
**20.20** Фантастыка «Паляўнічы».
**22.10** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».
**23.50** Драма «Сібір. Манамур».



**1.40** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**3.40** Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
**5.50** Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 12.30** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 18.40, 22.30, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55, 10.55** Аўта-SOS.
**9.25, 14.00, 19.30** Камета стагоддзя.
**10.10, 14.45, 20.15** Сутыкненне з астэроідам.
**11.40, 5.15** Шаша праз пекла.
**15.35** Мядзведзі апошняй мяжы.
**16.20** Экстрэмальная падарожжа.
**17.10, 0.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**17.55, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**21.00, 0.45, 3.45** Кіраванне натоўпам.
**21.45, 1.30, 4.30** Узлом Сістэмы.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўтроена?
**8.50, 11.20** Што было далей?
**9.40, 13.50, 22.10** Геній аўтадызайну.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**13.00, 6.24** Выжыванне без купюр.
**14.40, 5.36** Скрыўленне часу.
**16.20, 4.00** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**17.10, 4.48** Махінатары на трасе.
**18.50** Аляска: сям'я з лесу.
**19.40** Зорнае выжыванне.
**23.00** Махінатары.
**23.50** Вулічныя гонкі.
**0.40, 3.10** Бітвы за кантэйнеры.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

## СУБОТА, 25 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

6.55 Існасць.
**7.25 Меладрама «Начная фіялка».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 23.30 Камедыя «Кухня».**
**10.55** «Пра ежу!».
**11.25** Дача.
**12.10** Ток-шоу «Здароўе».
**12.50** Кулінарная дыпламатыя.
**13.25** Выхад ёсць.
**14.00 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.25 Да 70-годдзя Перамогі. Драма «Снайпер. Зброя пакарання». 1-я і 2-я серыі.**
**17.25 Меладрама «Птушка ў клетцы». 1-я — 4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.45 Камедыя «Закаханы і бяззбройны».**
**0.30** Дзень спорту.
**0.40** «Зорнае жыццё». «Аголеныя і адрынутыя».

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00 Камедыя «Усе ў захапленні ад Мэры».**
**9.00** Беларуская кухня.
**9.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**10.20** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**10.50, 21.50** Тэлебарометр.
**10.55** Анімацыя для ўсёй сям'і. «Хортан».
**12.20** Капейка ў капейку.
**12.55** Вось гэта дзіва!
**13.30 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**18.25** Футзал. Чэмпіянат свету. Матч за трэцяе месца.
**19.40** Хакей для ўсіх.
**20.25** Футзал. Чэмпіянат свету. Фінал.
**21.40** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.55 Да 70-годдзя Перамогі. Кінааповесць «Экіпаж машыны баявой».**
**23.15** Ток-шоу «Перазагрузка».
**0.00 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 11.50, 14.30, 0.10** Калейдаскоп.
**8.10 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. Кінаэпапея «Вызваленне». Фільм чацвёрты «Бітва за Берлін».**
**9.30** «Сімвал Перамогі». Польшча. Загінулым на Одэры.
**10.00 «Не хлебам адзіным». Драма.**
**12.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.35 «Залаты ланцуг». Драма.**
**14.00** «Навукаманія». Чарнобыль: праца над памылкамі.
**14.40** «Размаўляем па-беларуску».
**14.45 «Дзяўчына з характарам». Камедыя.**
**16.00** «Камертон». Артыст Брэсцкага тэатра лялек Раман Пархач.
**16.30** П.І. Чайкоўскі. «Лебядзінае возера». Спектакль Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра балета імя Леаніда Якабсона.
**18.30 «Развітанне ў чэрвені». Камедыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.05** «Раман з лёсам». «Алена Дрыгацкая. Ва ўвесь голас». Дак. фільм.
**21.30 «Апусцелы горад». Драма.**
**23.30** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Таццяна Салаўёва (Гродна).

### БЕЛАРУСЬ 5

**3.05, 12.10, 21.05** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**5.25** Тэніс.Турнір ВТА. Штутгарт. Чвэрцьфінал.
**7.00, 3.20** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Сэлфі.
**7.45** Муай-тай. К-1. Файт-шоу «Тонгкат».
**8.10, 11.05** Футзал. Чэмпіянат свету. Паўфінал.
**9.10, 18.55** Хакей. Еўрачэлендж. Беларусь — Нарвегія.
**14.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**14.30, 0.30** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт. Паўфінал.
**16.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Дынама» (Мінск).
**18.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.25** Футзал. Чэмпіянат свету. Фінал.
**2.30** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** «Васілій Ланавой. «Гонар маю!».
**13.50 Маст. фільм «Тайны палацавых пераваротаў. Смерць юнага імператара».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Барахолка».
**17.15** «100 мільёнаў».
**18.10** «Акадэмія талентаў. Курс чацвёрты».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.40** «Легенды Live». «Red Hot Chili Peppers».
**23.20** «Што? Дзе? Калі?».
**0.30 Маст. фільм «Поспех».**

### СТБ

**6.20 Маст. фільм «Аналізуй гэта».**
**8.05** «Тайны свету».
**9.00** «Разумней не прыдумаеш».
**9.45** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**10.45** «Гэта — мой дом!».
**11.15** «Мінск і мінчане».
**11.45 Серыял «Салдаты».**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Культурная сталіца».
**14.10, 1.30 Серыял «NEXT».**
**15.55** «Вялікі горад».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.15 Маст. фільм «Эпідэмія».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Адвакат д'ябла».**
**22.45** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.50** «Дакументальны праект»: «Помста паўшых».
**0.40** «Маска. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00, 8.40, 4.50** М/ф.
**8.10** «Саюзнікі».
**9.05** «Эксперыментатары».
**9.30** «Ой, мамачкі!».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.45, 23.20 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».**
**13.15 Маст. фільм «Супермозг».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Апошні бронецягнік».**
**21.05 Маст. фільм «Матч».**
**2.00 Маст. фільм «Прыгожы і ўпарты».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 15.50 Маст. фільм «Пацук».**
**10.10** «Планета сабак».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Мая планета».
**12.20 Маст. фільм «Прывітанне і бывай».**
**14.25** «Вызваліцелі».
**15.15** «Цуды Расіі».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40 Маст. фільм «З чыстага ліста».**
**22.30** «Танцы з Зоркамі». Сезон-2015.
**0.55 Маст. фільм «Усміхніся, калі плачуць зоркі».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05 Серыял «НС — надзвычайная сітуацыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Профіль забойцы».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**11.05** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Другая сусветная. Вялікая Айчынная». «Паляванне на правадыроў».
**14.20 Серыял «Версія».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**22.50 Маст. фільм «Гонар».**
**0.30** «Сапраўдны італьянец». «Прыгажосць па-італьянску».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.45, 19.10, 21.00, 23.15** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**10.40 Серыял «Радзіма».**
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.40, 15.45** «Хатняя крама».
**11.55 Камедыя «Знаёмства з бацькамі».**
**13.50 Камедыя «Знаёмства з Факерамі».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Камедыя «Марлі і я».**
**18.25 Серыял «Месца злачынства Маямі».**
**19.15 Маст. фільм «Дзіца Размары», 1—2 серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Прыгоды «Рыцар дня».**
**23.20** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00, 5.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00** Серыял «Святлафор 5».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хатняя кухня».
**12.30** Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
**15.00** Камедыя «Дублёр».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**19.00** «Імперыя ілюзій».
**21.00** Камедыя «Паміж анёлам і нячысцікам».
**23.40** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** Скетчком «Студэнты».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** 75 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Конанава. «Начальнік Чукоткі». Маст. фільм.
**12.00** «Астравы». Міхаіл Конанаў.
**12.45** Вялікая сям'я. Саломіны.
**13.40** «70 гадоў легендарнай сустрэчы на Эльбе. «Саюзнікі. Верай і праўдай!». Дак. фільм.
**14.40** «Сустрэча на Эльбе». Маст. фільм.
**16.25** «70 гадоў дырэктару Рускага музея. «Лінія жыцця». Уладзімір Гусеў.
**17.15** «Рамантыка раманса». Барысу Фаміну прысвячаецца.
**18.10** «Астравы». Леанід Быкаў.
**18.50** «Алёшкава каханне». Маст. фільм.



**20.15** «Дух у руху». Дак. фільм.
**21.30** «Белая студыя».
**22.10** Кіно на ўсе часы. «Афера». Маст. фільм.
**0.20** Джазавы фестываль у ММДМ.
**1.35** «Сландайк 2». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Скуратаў. Кат Івана Грознага».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Прэс-экспрэс». 1993 год.
**6.10, 6.35, 8.30, 9.40, 11.00, 11.40, 14.40, 15.40, 17.00, 17.45, 19.10, 20.25, 20.50, 21.55, 23.40, 0.50, 2.30, 3.40, 5.40** Музычная настальгія.
**6.30** М/ф «Гісторыя з адзінкай».
**7.00** Маст. фільм «Кароткія сустрэчы».
**8.45** М/ф «Вясёлае кураня».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 19.30, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30** М/ф «Як казак шчасце шукаў».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1959-ы. Паўтор ад 3.10.2009 года.
**13.10** Канцэрт замежнай эстрады.
**13.30** Маст. фільм «Пятля Арыёна».
**16.00** «Колба часу».
**17.20** «Атланты трымаюць неба». «Айчына нам Горны інстытут».
**20.40** М/с «Болек і Лёлек».
**21.00** «Быў час». 2010 год.
**22.20** Маст. фільм «Два Фёдары».
**0.00** «Эліта Краіны Саветаў». Былы дырэктар «Тэатра на Таганцы» Мікалай Дупак. 2007 год.
**1.10** Маст. фільм «Кветкі лугавыя».
**2.45** М/ф «Як кошачка і сабачка мылі падлогу».
**5.00** «Я САМА». Тэма: «Я выйшла замуж... позна». 1995 год.

### EUROSPORT

**9.30, 16.30, 1.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.00** WATTS.
**15.30** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
**0.00, 1.25** Конны спорт.
**1.15** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 19.25, 22.00, 3.10** Серыял «Сваты».
**6.50** Камедыя «Татулі».
**8.25** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**10.50** Камедыя «Віктар».
**12.25, 14.25, 15.15, 22.50, 0.45, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**12.40** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Прыгоды «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі 3D».
**17.45** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**20.20** Камедыя «Таймшэр».



**23.10** Камедыя «Каханне жыве тры гады».
**1.15** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**4.05** Камедыя «Спатканне ўсляпую».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.25, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**11.20** «Prокіно».
**11.30** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.25** «Гісторыі выратавання».
**13.00, 1.30** Серыял «Ізумрудная справа агента».
**16.20** М/ф «Планета 51».
**17.50, 4.30** «Без тэрміну даўнасці».
**18.45** Дак. фільм «Пазашлюбныя дзеці. За кулісамі поспеху».
**20.15** Маст. фільм «Вялікае каханне».
**22.05** Маст. фільм «Крутая Джорджыя».
**0.00** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.00** Камедыя «Ну што, прыехалі?».
**7.40** Камедыя «Атэль рамантычных спатканняў».
**9.15** Драма «Простыя ісціны».
**10.45** Драма «Скарб».
**12.35** Драма «Мушкецёры».
**14.25** Драма «Тайная цяга».
**16.20** Меладрама «Вечнае зззянне чыстага розуму».
**18.10** Камедыя «Экзамен для дваіх».
**20.00** Драма «Добрай ночы, Месяц».
**21.40, 4.45** Баявік «Вялікі куш».
**23.25** Драма «Нешта не так з Кевінам».
**1.30** Мюзікл «У рытме сэрца».
**3.10** Жахі «Ідэнтыфікацыя».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**7.05** Трагікамедыя «Нябесныя ластаўкі».
**8.25, 0.25** Казка «Казка. Ёсць».
**10.00** Драма «Легенда № 17».
**12.15** Камедыя «Дон Сезар Дэ Базан».
**14.50** Фантастыка «Паляўнічы».
**22.15** Драма «Неба паўшых».
**2.05** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
**4.30** Драма «Маладая жонка».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 10.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55** Панарама 360.
**8.40** Гульні розуму.
**9.25** Займальная навука.
**12.30** Навука будучыні.
**13.15** Космас: Прастора і час.
**14.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Адзін акіян.
**16.20** Згряя.
**17.10** Секунды да катастрофы.
**17.55** Мегацунамі.
**18.40** Найгоршае надвор'е ўсіх часоў?
**19.30, 0.00, 5.15** Эвакуацыя Зямлі.
**21.00, 0.45** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.36** Вулічныя гонкі.
**8.50, 15.30** Геній аўтадызайну.
**9.40, 16.20, 0.40, 6.24** Махінатары.
**10.30** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**11.20** Гульня камянёў.
**12.10** Залатая ліхаманка.
**13.00, 4.00** Скарбы з каморкі.
**13.50, 23.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.40** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**18.00** Дамы на дрэвах.
**18.50** Майстар па стварэнні басейнаў.
**19.40** Акварыумны бізнес.
**20.30** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**23.00** Зорнае выжыванне.
**2.20** Хуткія і гучныя.
**3.10** На краі Аляскі.
**4.48** Як гэта ўстроена?
**5.12** Як гэта зроблена?
**7.12** Хаос у дзеянні.

## Такое жыццё

## САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ КРАІНЫ

**Даследаванне было праведзена амерыканскім інстытутам па вывучэнні грамадскай думкі Gallup. Высветлілася, што народы Лацінскай Амерыкі адчуваюць сябе самымі шчаслівымі на планеце.**



Рэйтынг складаўся зыходзячы з індэкса станоўчага вопыту, які быў разлічаны ў выніку апытання, праведзенага ў 143 краінах сярод паўналетніх грамадзян. Колькасць рэспандэнтаў склала каля дзесяці тысяч. Удзельнікам апытання прапаноўвалася адказаць на пяць пытанняў, сярод якіх былі такія, як «учора вы адчувалі сябе добра адпачыўшым?», «учора вы смяяліся або шмат усміхаліся?» і «учора да вас ставіліся з павагай цэлы дзень?».

У апублікаваным дакладзе гаворыцца, што ўпершыню за 10 гадоў усе дзяржавы ў спісе самых шчаслівых з'яўляюцца краінамі Лацінскай Амерыкі. Так, у першай тройцы знаходзяцца Парагвай, Калумбія і Эквадор. Узровень іх індэкса станоўчага вопыту складае 89 у першай і 84 у дзвюх другіх адпаведна. Каля 70% рэспандэнтаў у ходзе апытання заявілі, што адчуваюць радасць, усміхаюцца або смяюцца. Сярод краін з самым нізкім узроўнем радасці на першых радках апынуліся Судан, Туніс і Бангладэш з індэксам 47, 52 і 54 адпаведна. Там адзначана, што асноўная прычына гэтага — наяўнасць крызісу ў краіне. У спіс самых няшчасных трапілі і краіны былога СССР — Грузія і Літва: індэкс абедзвюх роўны 55.

Характэрна, што агульнасусветны індэкс станоўчага вопыту склаў 71 і практычна не змяняецца на працягу апошніх гадоў.

## СМЕРЦЬ СТАРЫХ НАГАДАЛА «ДЗЁННІК ПАМЯЦІ»

**У ЗША з розніцай у пяць хвілін памерлі муж і жонка, якія пражылі ў шлюбе 73 гады. Смерць заспела мужа і жонку, якія пакутавалі ад хваробы Альцгеймера, у розных дамах састарэлых, але ўсё роўна нагадала сведкам фінальную сцэну вядомага фільма «Дзённік памяці».**



Аб практычна сінхроннай смерці пары Вільяма і Ліліян Вілсан журналістам распавёў іх сын Даг. Яго бацькі пазнаёміліся яшчэ ў школе. Абое захапляліся спортам: яна гуляла ў баскетбол, а ён — у мясцовай камандзе амерыканскага футбола. Яшчэ зусім юныя, яны збеглі з дому ў 1941 годзе, каб узяць шлюб. Неўзабаве Біл быў прызваны ў войска і ваяваў з нацыстамі аж да 1945 года.

Апошнія гады пара правяла ў розных дамах састарэлых. Званкі аб іх смерці заспелі іх сына Дага Вілсана з розніцай у пяць хвілін: 93-гадовы Біл памёр у 3:52 раніцы, а яго 89-гадовая жонка — у 03:57. Калі той паведаміў пра гэта медсястры ў цэнтры, дзе памёр яго бацька, тая ўсклікнула: «Божухна, зусім як у «Дзённіку памяці!» (дзе галоўныя героі паміраюць у адзін дзень у доме састарэлых).

zepter bank

**Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»**

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б

эл. адрес: info@zepterbank.by.

Тел.: 331 89 49, факс 331 89 48

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 апреля 2015 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2015 | 01.04.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 23 581 | 22 107 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 51 142 | 45 381 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 39 518 | 57 430 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 274 632 | 101 767 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 285 887 | 328 916 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 63 450 | 35 526 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 1 535 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 19 760 | 3 339 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 759 505 | 594 466 |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 7 992 | 7 878 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 73 612 | 39 508 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 291 019 | 223 574 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 30 000 | 27 451 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 17 662 | 7 301 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 420 285 | 305 712 |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 149 487 | 149 487 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 9 609 | 8 571 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 41 337 | 26 461 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 138 787 | 104 235 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 339 220 | 288 754 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 759 505 | 594 466 |

Председатель Правления Проворов Михаил Игоревич

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания «02» апреля 2015 г.

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**на 1 апреля 2015 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2015 | 01.04.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 18 414 | 17 479 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 12 995 | 7 448 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 5 419 | 10 031 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 418 | 2 073 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 309 | 324 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 109 | 1 749 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 61 | 729 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 62 335 | 8 047 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (464) | (5) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 31 143 | 4 147 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 945 | 222 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 12 824 | 8 872 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 540 | 414 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 26 898 | 7 340 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 5 836 | 1 043 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 21 062 | 6 297 |

Председатель Правления Проворов Михаил Игоревич

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания «02» апреля 2015 г.

**Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта: www.zepterbank.by/О-банке/Финансовая-отчетность/Ежеквартальный-отчет.aspx**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 31 от 28.05.2013 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214.

■ Неасабісты суб'ектыў



# СМАЧНА ЕСЦІ?

## Пакуль у дачыненні да нацыянальнай кухні — менавіта з пытальнікам

ІДЭЯ Прэзідэнта стварыць сетку беларускай нацыянальнай кухні, якую ён агучыў на днях падчас рабочай паездкі на Міншчыну, доўга трымалася ў топ-лісце навін і актыўна каментавалася на розных сайтах. Што само па сабе не дзіва: на адсутнасць добрага апетыту беларусы ніколі не скардзіліся, а за апошнія гады мы сталі яшчэ і гурманамі: маючы сродкі і магчымасці, чаму б розныя прысмакі і не падэгуставаць. Але вось што дзіўна (мяркую па сабе, але многія, думаю, са мной пагодзяцца): чым больш каштуеш усялякіх там сушы, фуа-гра, кары-вуд (я не кажу ўжо пра банальную піцу ды лазанню), тым больш хочацца свайго.

Напрыклад, бульбы. Не смажанай на патэльні са скваркамі — гэтую радасць і дома можна за паўгадзіны зрабіць. Вось каб дранікаў з грыбамі або з духмянымі травамі. Або бабкі — з залацістай скарыначкай, з празрыстымі кавалачкамі сала ўсярэдзіне... Ці бліноў. З верашчакай, з дамашняй каўбасой. Або з мачанкай, у якой скабачкі плаваюць. Я ўжо не кажу пра розныя выкшталцоныя прысмакі, што бабулі гатавалі толькі на вялікія святы: зразы, гудаўку, нашпігаваную зяленівам, гусь у журавінавым ці парэчкавым соусе, тварожнікі...

АЛЕ хацець, як кажуць, не шкодна. Пры ўсім жаданні пакаштаваць сёння штосьці з вышэйпералічанага ў нашых пунктах грамадскага харчавання наўрад ці атрымаецца. А калі і атрымаецца, то гэта ў пераважнай большасці сваёй будзе проста пародыяй на нацыянальную кухню. У бістро вам прапануюць у найлепшым выпадку бульбу фры (яе, з гонарам і маючы на тое падставы, лічаць сваім нацыянальным вынаходствам бельгійцы). У дарагім рэстаране можна пакаштаваць нешта падобнае да дранікаў або тоненькія, аж свецяцца, анучкі з цеста, якія ў меню завуцца чамусьці блінамі і на якія ніводная паважаючая сябе гаспадыня і глядзець бы не захацела.

З дранікамі ў мяне наогул канфуз выйшаў. У Вільні літоўскі калега ўзяўся частаваць сваімі нацыянальнымі стравамі. «Вось бульбяныя бліны, абавязкова пакаштуй, у вас у Беларусі такіх няма», — настойліва тыцкаў ён пальцам у меню. Замест нечага адмысловага прынеслі нашы родныя дранікі, праўда, зробленыя, як трэба — і засмажаныя да пэўнай ступені, і духмяныя, і тлушч з іх не капаў. Давялося есці і хваліць. Праўда, пасля мы ледзь не пасварыліся, вызначаючы паходжанне і прыналежнасць гэтых самых «бульбяных бліноў». Сышліся на тым, што ён прыедзе ў Мінск і ўжо я яго буду частаваць імі ж у беларускай інтэрпрэтацыі.

І што вы думаеце? У адным з мінскіх рэстаранаў, які пазіцыянуе сябе як «рэстаран беларускай кухні», нам замест заказаных па меню «дранікаў з грыбамі» прынеслі на прыгожых талерках па тры кволыя пляскачыкі шэрага колеру, побач з якімі на лісціку салаты горкай ляжалі смажаныя шампіньёны (на думку рэстаратараў, пэўна, гэта самыя беларускія грыбы)... Карацей, ратаваць гонар любімай нацыянальнай стравы, а калі падумаць, дык у нейкім сэнсе і краіны, давялося самой. Чысціла бульбу, церла на тарцы, мачыла, адварвала і смажыла сушаныя баравікі, абірала і рэзала пякучую цыбулю... Віленскі госць еў, аж за вушамі трашчала. Але асадак, як кажуць, застаўся.

ДА чаго я гэтую гісторыю, уласна, прыгадала. Людзі, якія возьмуцца ажыццяўляць ідэю стварэння цэлай сеткі нацыянальнай кухні, безумоўна, знойдуцца, бо справа цікавая, запатрабаваная, а калі з толкам рабіць, дык і выгадная. Толькі вось каб у пагоні за запатрабаванасцю і выгаднасцю яны не забыліся пра тое, што ў меню галоўнае не змест, а напаўненне. Што мала ў ім напісаць адмысловыя назвы страў, на якія стомленыя заморскімі прысмакамі нашы і іншаземныя гурманы несумненна спакусяцца. Галоўнае — каб пакаштаваўшы гэтую страву, яны, выбачайце, не плюнулі.

І тут патрэбна цэлая сістэма (калі ўжо размова ідзе пра сетку, дык і гэта паняцце тут дарэчы). Пачынаючы ад стварэння нацыянальнай школы кухараў. Нездарма ж любы рэспектабельны рэстаран італьянскай ці французскай кухні лічыць справай гонару накіраваць свайго шэф-кухара вучыцца ў Італію або Францыю. У нас такой школы пакуль няма, але, у адрозненне ад заходніх суседзяў, якія харчуюцца больш у рэстаранах ды кавярнях, чым дома, захаваліся выдатныя традыцыі дамашняй кухні, з адмысловымі рэцэптамі тых жа нацыянальных страў. Праўда, сапраўдныя гаспадыні не вельмі гатовы імі дзяліцца (на фестывалі «Мотальскія прысмакі», напрыклад, паляшучкі аб складзе сваіх страў часцей за ўсё кажуць прыблізна). Але ж іх можна зацікавіць — «ганарарам», указаннем аўтарства... варыянты знойдуцца. А яшчэ падняць старыя кулінарныя кнігі, якія выдаваліся і перавыдаваліся на нашых землях у мінулыя стагоддзі, прыцягнуць да гэтай справы гісторыкаў, гатовых падзяліцца сваімі ведамі, набытымі ў бібліятэках ды архівах... Але і гэтага будзе мала, калі тыя, хто непасрэдна возьмецца арганізоўваць і гатаваць, не будзе паважаць і ведаць нацыянальныя традыцыі і гісторыю, у якіх нацыянальная кухня — неад'емная, важная частка.

АПАСЛЯ ўсё гэта з пэўнымі каментарыямі і гістарычнымі даведкамі падаць. Бо маркетынг, як ні круці, у наш час вялікая сіла. Пераканалася ў гэтым на Вялікдзень. Акрамя звычайных булак ды ўсялякіх мясных прысмакаў, проста закарцела згатаваць «Каралеўскі сырнік» па рэцэпце звяздоўскага кухмістра Верашчакі. Атрымалася смачна і прыгожа, але стол ламіўся ад ўжо знаёмага і праверанага, а сырнік сіратліва бліскаў сваім залітым шакаладам некранутым верхам. «Людзі, каштуйце сырнік. Менавіта такі падавалі ў кавярні бабці Ксаверыны ў Івянцы ля Белага касцёла ў 30-я гады мінулага стагоддзя!..» Рукі пацягнуліся з усіх бакоў, і праз колькі хвілін на месцы новай стравы з нявыдуманай гісторыяй стаяла пустая талерка.

Прыклад адзінкавы, але вельмі паказальны. Цяпер буду запрашаць гасцей на Івянецкі сырнік, гэта стане маёй фірмовай стравай. Зрэшты, рэцэптам падзялюся з ахвотай. Або ў «Звяздзе», калі што, шукайце.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Фінансавы выдатнік

# НА АГУЛЬНАЙ МОВЕ З БАНКАМАТАМ

**Разумная тэхніка ўсё мацней пранікае ў наша паўсядзённае жыццё. Напрыклад, у банкаўскім сектары сёння аўтаматызуюцца амаль усе стандартныя аперацыі. Аднак і ў гэтым выпадку чалавечы фактар не выключаецца, калі ўладальнік банкаўскай карткі дакладна не ведае алгарытм камунікацыі з машынай. Мы працягваем завочную кансультацыю па тэме безнаяўных разлікаў. На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае выканаўца абавязкаў дырэктара акцыянернага таварыства «Плацежная сістэма БЕЛКАРТ» Уладзімір ГУСАРАЎ.**

### СПЯШАЦЦА ЛЕПШ БЕЗ МІТУСНІ

***— Парайце, што мне рабіць, калі згубіў картку, а таксама калі банкамат не вяртае яе ці не выдае грошы? Як неабходна дзейнічаць пры выяўленні лішняй аперацыі?***

**Аляксандр Трызна,**
***г. Мінск.***

— Спачатку звярну ўвагу на тое, што ёсць карткі, якія можна выкарыстоўваць для рознага тыпу аперацый з подпісам на карт-чэку і з уводам ПІН-кода або толькі з уводам ПІН-кода. Для вядзення бягучых плацяжоў па сямейным бюджэце ідэальным варыянтам, на мой погляд, з'яўляюцца карткі, дзе ўсе тыпы плацяжоў (наяўныя і безнаяўныя) выконваюцца з уводам ПІН-кода. Такім банкаўскім прадуктам могуць быць карткі БЕЛКАРТ ці некаторыя карткі Maestro. У гэтым выпадку, калі картка страчана ці была забыта ў банкамаце, вашы сродкі, якія засталіся на рахунку, будуць захаваны.

Тым не менш у любым выпадку, калі картка была згублена ці банкамат яе «прысвоіў», неабходна звязацца з кантакт-цэнтрам банка і заблакіраваць яе. Гэтую працэдуру можна выканаць і праз інтэрнэт-банкінг. У нас у краіне большасць банкаў прадастаўляюць кліентам такую магчымасць.

У выпадку збояў у працы банкаматаў сустракаюцца факты, калі апарат не выдае грошы, а сума на картцы памяншаецца. У гэтым выпадку неабходна звярнуцца ў аддзяленне банка, і яго спецыялісты хутка ацэняць сітуацыю і правядуць аперацыю вяртання грашовых сродкаў. Асобна звярну ўвагу на тое, што калі вы бачыце, што банкамат працуе неяк марудна, то не трэба адыходзіць ад яго адразу пасля ўводу ПІН-кода: магчыма, праз 20-30 секунд купюры ўсё ж будуць выдадзены. Тады іх можа атрымаць ужо іншы чалавек, а даказаць у банку правільнасць сваіх дзеянняў кліенту будзе даволі складана.

Калі ў выпісцы па рахунку з выкарыстаннем карткі вы адшукалі лішнюю аперацыю і сапраўды ведаеце, што яе не выконвалі, неабходна як мага хутчэй звярнуцца ў банк. Тэрмін звароту з заявай аб апратэставанні несанкцыянаванай аперацыі — 30 дзён з даты яе правядзення. Калі аперацыя кліентам не выконвалася, то банк верне яму грошы ў адпаведныя з заканадаўствам тэрміны.

### УНІВЕРСАЛЬНЫ КОД НЕ ЗАЎСЁДЫ ПЛЮС

***— У мяне тры банкаўскія карткі з рознымі кодамі, якія я часцяком блытаю. Ці можна памяняць ПІН-код карткі і як гэта зрабіць?***

**Аксана Кастунова,**
***г. Гомель.***

— Сёння ў нашай краіне на 9,5 млн чалавек насельніцтва выпушчана больш за 12 млн банкаўскіх картак, таму ў многіх грамадзян на руках па 2 або нават 6 дзейных банкаўскіх картак розных плацежных сістэм. Відавочна, што запомніць столькі ПІН-кодаў — для некаторых праблема.

Сёння фінансавыя інстытуты гэтае пытанне разглядаюць і многія з іх, напрыклад Белінвестбанк, прапануюць паслугу змены ПІН-кода. Стандартная змена ПІН-кода выконваецца пры дапамозе банкамата з выкарыстаннем карткі. Яе трымальнік выбірае ў меню банкамата адпаведны ўказальнік — увод ПІН-кода, а потым набірае новы ПІН-код і пацвярджае яго. Такая аперацыя займае менш за хвіліну, але, хутчэй за ўсё, банк за такую працэдуру возьме плату.



**Насамрэч, спрачацца з банкаматам немагчыма.**

Сапраўды, пасля выканання такой нескладанай аперацыі можна ўстанавіць на любую колькасць картак адзін ПІН-код. Праўда, пры гэтым важна разумець, што страта «ўніверсальнага» ПІН-кода павялічвае верагоднасць крадзяжу з картак.

* * *

**Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты (info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «Для аддзела эканомікі») ці па тэлефоне: 8 017 292 38 02.**

**Сяргей КУРКАЧ**

# ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,
Телефон: +375 17 283 15 10

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2015 г.

Наименование банка: ОАО «Технобанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 193 446 | 135 956 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 4 248 | 3 293 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 141 385 | 104 318 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 183 992 | 275 514 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 288 580 | 23 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 177 950 | 837 066 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 52 | 52 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 218 911 | 219 412 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 36 898 | 23 239 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 31 919 | 20 170 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **2 277 381** | **1 619 043** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 386 | 35 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 235 322 | 147 231 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 1 495 825 | 943 831 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 5 087 | 70 554 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 27 198 | 24 286 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **1 763 818** | **1 185 937** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 112 000 | 111 993 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 17 297 | 12 597 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 182 899 | 183 690 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 201 367 | 124 826 |
| **30** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **513 563** | **433 106** |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **2 277 381** | **1 619 043** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2015 г.

Наименование банка: ОАО «Технобанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 66 103 | 44 058 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 30 432 | 15 874 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | | **35 671** | **28 184** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 30 303 | 20 131 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 4 364 | 3 341 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | | **25 939** | **16 790** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 125 | 7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 1 189 | 1 962 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 18 415 | 14 572 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (672) | 4 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 23 630 | 1 884 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 2 001 | 581 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 45 212 | 32 872 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 3 253 | 2 188 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 10 573 | 25 156 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 388 | 4 435 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **8 185** | **20 721** |

Председателя Правления Д.Л.Михалевич

Главный бухгалтер Н.А.Кузьмицкая

Дата подписания «02» апреля 2015 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г.

**Годовая финансовая отчетность размещена на странице интернет-сайта: https://tb.by/about/finotch/yearotchet/**

